


АПОШНІЯ ПАДЗЕІ ГУЛЬНЯЎ 8-9

ШТО ЗНАЙШЛІ АРХЕОЛАГІ КАЛЯ МЕНКІ? 11





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 ЖНІЎНЯ 2023 г. СУБОТА № 155 (30035)


З першых вуснаў

# «МЫ ЗНОЙДЗЕМ ВЫХАД З ЛЮБОЙ СІТУАЦЫІ І Ў БЯДЗЕ СВАЕ ПРАДПРЫЕМСТВЫ НЕ ПАКІНЕМ»

**Падчас наведвання Нацыянальнага аэрапорта Мінск і Мінскага завода грамадзянскай авіяцыі № 407 Прэзідэнт азнаёміўся з дзейнасцю авіяцыйнай галіны і пагутарыў з працоўнымі калектывамі**

**Кіраўніку дзяржавы далажылі аб рабоце авіяцыйнай галіны ва ўмовах санкцый, бягучых задачах і перспектывах развіцця Нацыянальнага аэрапорта Мінск, які з'яўляецца галоўнымі паветранымі варотамі краіны. На Мінскім заводзе грамадзянскай авіяцыі № 407 Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з вытворчымі ўчасткамі прадпрыемства, даведаўся аб выніках работы і перспектыўных кірунках далейшай дзейнасці.**





Фота БелТА.

## «Мы ўсё на перспектыву робім»

Прэзідэнту далажылі аб развіцці інфраструктуры Нацыянальнага аэрапорта Мінск, аб транспартных зносінах са сталіцай па чыгунцы, паркінгах, якія тут плануюць пабудаваць. Ішла гаворка і аб будаўніцтве новага пасажырскага тэрмінала: яго неабходнасць абумоўлена ростам пасажырапатоку, які ў Нацыянальным аэрапорце ўжо пераадолеў планку 5 мільёнаў чалавек у год.

Кажучы аб планах, Аляксандр Лукашэнка папрасіў рацыянальна падыходзіць да ўсіх рашэнняў. Ён згодны, што дабірацца да аэрапорта па чыгунцы будзе зручна для пасажыраў. Але не варта, па яго словах, будаваць дубліруючых, паралельных шляхоў. Трэба, на думку беларускага лідара, выкарыстоўваць тое, што ўжо ёсць.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка даручыў падрыхтаваць адпаведны праект па рэканструкцыі аэрапорта з будаўніцтвам тэрмінала і чыгуначнай веткі, каб дэталёва яго разгледзець. «Мы ж усё на перспектыву робім, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Калі сёння з прычыны існуючых абставін нешта не патрэбна, то варта разумець, што гэта можа спатрэбіцца заўтра».

СТАР. 2-3

## КОРАТКА

- **Заўтра ў краіне адзначаецца Дзень будаўніка. З гэтай нагоды Аляксандр Лукашэнка павіншаваў работнікаў і ветэранаў будаўнічага комплексу Рэспублікі Беларусь з прафесійным святам.**
- У Беларусі ўбралі амаль 60 працэнтаў плошчаў збожжавых і зернебабовых. Намалочана 3,853 млн т збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 33,8 ц/га.
- **Замежныя інвестары ў студзені—чэрвені ўклалі ў эканоміку Беларусі $4,5 млрд.**
- З'езд малых гарадоў Гродзенскай і Ніжагародскай абласцей пройдзе ў Зэльве ў верасні.
- **З залпам і малітвай. У Стоўбцах перапахавалі астанкі 17 герояў вайны.**
- Другі Міжнародны антыфашысцкі кангрэс пройдзе ў Мінску 17—19 жніўня.
- **Агенцтва па кіраванні актывамі выкупіць запазычанасць па крэдытах Лідскай абутковай фабрыкі.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ЛУЦКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Вы ведаеце, у чым шчасце Беларусі? Шчасце Беларусі ў тым, што ў яе працоўная моладзь, а не тая, што ваюе. Але для таго, каб стварыць працоўную моладзь, трэба яе нарадзіць, выхаваць, навучыць. Разумееце, якая ў гэтым роля дзяржавы і колькі працы ёй гэта каштуе? Колькі работы робіць Прэзідэнт, удзяляючы гэтаму максімальную ўвагу. Столькі маладзёжных ініцыятыў падтрымлівае наш Прэзідэнт. Ні адзін Прэзідэнт столькі не робіць, колькі наш Прэзідэнт робіць для моладзі».*

Пад кантролем

# НА ВАРЦЕ ХАРЧОВАЙ БЯСПЕКІ

**Карэспандэнты «Звязды» разам з міліцыянерамі наведалі адну з гаспадарак Міншчыны і пракантралявалі ход уборачнай кампаніі**



**Жніво — гарачая пара не толькі для аграрыяў. Многія дзяржаўныя органы і службы зацікаўленыя ў гарантаванні харчовай бяспекі ў нашай краіне. Каб своечасова і без страт сабраць ураджай, меры прымаюць і супрацоўнікі органаў унутраных спраў.**

СТАР. 4

Сам-насам з прыродай

# НЕ ЧАПАЙЦЕ ЗВЯРЫНЫХ ДЗІЦЯНЯТ!

**Як паводзіць сябе пры сустрэчы з дзікімі жывёламі, раяць спецыяліст і бывалы ляснічы**

**Прайшлі дажджы, у лясах сталі паяўляцца грыбы, аб чым сведчаць машыны на ўзбочынах. Гэта значыць, што на лясныя паляны пацягнуліся не толькі спрактыкаваныя грыбнікі, але і гараджане-аматары. А лес поўны жыцця. Няхай і не вельмі вялікая, але заўсёды ёсць верагоднасць сутыкнуцца падчас «ціхага палявання» з лясным насельнікам. Дзікую жывёлу можна сустрэць і не ў лесе, а каля рэчкі, на дарозе. Таму важна знаць правілы паводзін, а галоўнае, выконваць іх, каб не паўтараць памылак, часам трагічных.**

СТАР. 7



ISSN 1990 — 763X

# «МЫ ЗНОЙДЗЕМ ВЫХАД І Ў БЯДЗЕ СВАЕ ПРАДПРЫЕМСТВЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пэўныя даручэнні дадзены Прэзідэнтам і па рэканструкцыі старой узлётна-пасадачнай паласы аэрапорта. Другую пабудавалі ў 2019 годзе. Нягледзячы на тое што цяпер транспартны паток не такі, як быў раней, не варта забываць і аб першай паласе — вось патрабаванне кіраўніка дзяржавы. «Майце на ўвазе, што гэтая паласа павінна быць у рабочым стане, — папярэдзіў ён. — Нармальным стане. Мы пабудавалі другую. Гэта не павінна быць кінута. Паласа павінна быць у ідэальным стане». Паводле яго слоў, спасылацца на абставіны тут недарэчы.

У цэлым, нягледзячы на цяжкасці з-за ўведзеных санкцый, Нацыянальны аэрапорт Мінск працуе стабільна. Не ўзнікае праблем і ў забеспячэнні матэрыяламі і абсталяваннем. Па асобных пазіцыях наладжана вытворчасць на айчынных прадпрыемствах. Дапамагаюць і краіны-партнёры, у прыватнасці Кітай.

З аб'ектамі, якія знаходзяцца на тэрыторыі аэрапорта, Прэзідэнт падрабязна азнаёміўся па дарозе на Мінскі завод грамадзянскай авіяцыі № 407, куды ехаў на аўтобусе. На прадпрыемстве кіраўніку дзяржавы далажылі аб перспектывах развіцця завода. Аляксандр Лукашэнка пабываў у цэхах, дзе паглядзеў, як наладжаны тэхнічнае абслугоўванне і рамонт самалётаў.

Па словах генеральнага дырэктара Мінскага завода грамадзянскай авіяцыі Уладзіміра Пякарскага, вытворчыя магутнасці прадпрыемства поўнасцю загружаныя. Доля экспарту ў аб'ёме выручкі за першае паўгоддзе склала 98,8 %. На тэрыторыі завода ўзводзіцца комплекс змыўкі і пафарбоўкі паветраных суднаў. Завяршыць будаўніцтва плануецца ў першым квартале 2024 года. Пасля выхаду комплексу на поўную магутнасць дадатковая выручка для завода складзе больш як Вr13 млн, экспарту — $4 млн. Пашыраць кірункі дзейнасці плануецца і за кошт асваення тэхнічнага абслугоўвання новых тыпаў самалётаў, вырабу дэталяў і зборачных адзінак, вырабу і рамонту сродкаў наземнага абслугоўвання, камплектуючых вырабаў паветраных суднаў.

«Пабудаваць самалёт — дарагая рэч, таму трэба рамантаваць», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Аднак ён не выключае, што ў будучыні беларускія майстры змогуць стварыць айчынны самалёт.

***Традыцыйна падчас наведвання прадпрыемстваў Прэзідэнт сустракаецца з працоўнымі калектывамі. Гэтая рабочая паездка кіраўніка дзяржавы не стала выключэннем. Супрацоўнікі арганізацый, размешчаных на тэрыторыі Нацыянальнага аэрапорта Мінск, задалі беларускаму лідару шэраг пытанняў.***

## «Няшмат выпадкаў, калі высокатэхналагічныя прадпрыемствы так працуюць»

Аднак найперш Прэзідэнт падзякаваў рабочым, што асвоілі новы завод, і нагадаў яго гісторыю. «Вядома, дзе (у Мінску. — **«Зв.»**) мы знаходзіліся, зразумела, што нас не задавальняла размяшчэнне завода ў той час, — заўважыў ён. — Не толькі таму, што фактычна гэта ў цэнтры горада і што трэба было там рэалізоўваць інвестыцыйныя праекты. А і таму, што ўзлётна-пасадачная паласа, як дырэктар толькі што расказваў, нас там не задавальняла. Карацей, гэта ж не месца для такога завода. Было прынята рашэнне па пераносе прадпрыемства сюды. Але калі вы думаеце, што гэта ўсё так было проста, вы памыляецеся».

У сувязі з апошнім кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ўсе астатнія прапановы былі на ліквідацыю завода. Прэзідэнта пераконвалі, што прадпрыемства непатрэбнае: казалі, што тут рамантуюцца старыя самалёты, якія хутка лятаць не будуць. «Я быццам бы і пагадзіўся, але задаў тым, хто ўносіў прапановы, адно пытанне: а што будзем рабіць з людзьмі? — расказаў дэталі Аляксандр Лукашэнка. — Не проста людзьмі, якіх трэба заняць. Вядома, мы занялі б паўтысячы чалавек — гэта не праблема. Гэта высокакваліфікаваныя людзі — гэта значыць вы».

Па словах беларускага лідара, праца спецыялістаў авіягаліны вельмі дорага каштуе. «Што мы будзем з імі рабіць? — згадаў, як прымалася рашэнне аб захаванні прадпрыемства, Прэзідэнт. — Яны куды пойдуць? Адказу не было. Таму было прынята мной рашэнне аб пераносе таго завода з беларускай сталіцы і размяшчэнні тут».

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што часта лятаў з першай паласы і ўвесь час назіраў за будоўляй. З-за тармажэння будаўніцтва давялося прыняць адпаведныя меры. У рэшце рэшт завод пабудавалі. Па словах Прэзідэнта, яго складана называць толькі заводам. Прадпрыемства, на думку беларускага лідара, з'яўляецца першым крокам у дадзеным кірунку, і дзяржава плануе яго развіваць: будзе рабіцца ўсё для таго, каб у нашай краіне рамантаваліся і абслугоўваліся авіятэхніка, а магчыма, і ствараліся свае самалёты.

Прэзідэнт нагадаў, што ў Беларусі існуюць дзве такія буйныя пляцоўкі: у Баранавічах функцыянуе ваенны завод, на тэрыторыі Нацыянальнага аэрапорта Мінск рамантуюць і абслугоўваюць грамадзянскія лайнеры. «Калі вы асвоіце нешта з ваенных кірункаў, я буду толькі ўдзячны і падтрымліваць, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Калі там (у Баранавічах. — **«Зв.»**) нешта будуць рабіць для вас, для цывільных, я таксама падтрымаю гэта. Калі ўдасца нам разгарнуцца і стварыць свой лятальны апарат, я буду шчаслівы — мая мара новая можа збыцца».

У такой сувязі кіраўнік дзяржавы нагадаў пра тое, як ствараўся беларускі аўтамабіль, што калісьці таксама быў марай Прэзідэнта. Цяпер аўтамабілі маркі «Джылі» добра сябе зарэкамендавалі, карыстаюцца попытам. Сёлета будзе створана 60 тысяч аўтамабіляў. «У мяне ёсць такая шалёная думка па паглыбленні вытворчасці грамадзянскіх самалётаў, — паведаміў кіраўнік дзяржавы. — Мы асвоілі рамонт, тэхнічнае абслугоўванне асвоілі. Прэтэнзій практычна да вас няма з боку заказчыка. Будзем рухацца далей».

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што да наведвання завода і даклада дырэктара ён не думаў, што прадпрыемства так разгарнулася. «Вы — проста малайцы, — звярнуўся Прэзідэнт да калектыву. — Галоўнае, што вы знайшлі свае нішы (але гэта неканчаткова), вы навучыліся рабіць не толькі тое, што вы рабілі там, на старым заводзе, але і многае новае. Вы займаецеся імпартазамяшчэннем. Таму я вам шчыра кажу: вы — проста малайцы, і вам за гэта вельмі ўдзячны. Будзем у гэтым кірунку рухацца. Вось самае галоўнае, што я хацеў сказаць вам, наведваючы гэты завод. Я ўзлятаў, садзіўся ў нашым аэрапорце, увесь час глядзеў на гэты завод і думаў: ужо час туды прыехаць пагледзець, як выканана даручэнне. Вы яго выканалі. Нярэдкі выпадак, але і няшмат такіх выпадкаў, калі высокатэхналагічныя прадпрыемствы так працуюць».

У сувязі з чым новае даручэнне ад Прэзідэнта — усіх «вінаватых» прадставіць да дзяржаўных узнагарод.

«Будзем развівацца, — запэўніў работнікаў беларускі лідар. — Далей у нас на чарзе — чыгунка, каб мы з цэнтра Мінска, паблізу забіралі людзей і прывозілі сюды. Я думаю, што ў хуткім часе мы ажыццявім гэты план. А вы паменш звяртайце ўвагі на той ціск, які ажыццяўляецца з боку гэтага ашалелага Захаду на нашы прадпрыемствы, у тым ліку на аэрапорт, на «Белавія». Мы знойдзем выхад з любой сітуацыі і ў бядзе свае прадпрыемствы не пакінем. Свет узаемазалежны, і толькі вар'яты могуць разбурыць гэтую залежнасць. Нічога ў іх не атрымаецца. Мы прарвёмся. Ім не патрэбныя канкурэнты перш за ўсё, таму яны нас цiснуць. Гэта добрая ацэнка для нас».



Фота БелТА.

## Дзяўчына з Беларусі паляціць у космас у першым квартале будучага года

Бортправадніца авіякампаніі «Белавія» нагадала, што яе калега Марына Васілеўская выбрана ў якасці касманаўта для палёту на Міжнародную касмічную станцыю. Калектыў ганарыцца калегай, хвалюецца за яе. Бортправадніца пацікавілася ў Прэзідэнта, калі будзе ажыццёўлены палёт і ці не паўплывае на гэта міжнародная сітуацыя.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ў свой час вёў перагаворы з расійскім кіраўніцтвам. «І я Прэзідэнту Расіі сказаў, што беларусы неяк засядзеліся на зямлі, — прывёў дэталі размовы ён. — Лятаюць усе там, і афрыканцы ў тым ліку. Малайцы. Але чаму беларусы не лятаюць?»

У перагаворным працэсе ўдзельнічалі прадстаўнікі «Раскосмасу», для палёту ў космас ім патрэбная была жанчына. «Калі ласка, у нас жаночая краіна, Прэзідэнт жаночы, можна сказаць, — я гэта не хаваю, — згадаў, як прымалася рашэнне аб палёце касманаўта з Беларусі, Аляксандр Лукашэнка. — Знойдзем жанчыну. Знайшлі — Марыну. Мы плануем, што яна паляціць у першым квартале будучага года. Можа быць, у сакавіку».

Па словах кіраўніка дзяржавы, тэрмін палёту ссунуўся з-за аварыі на МКС, якая адбылася. Аднак, як акцэнтаваў увагу Прэзідэнт, наша дзяўчына паляціць, дублёр таксама, і ніякія абставіны на гэта паўплываць не могуць.

## «Спорту — быць!»

Супрацоўнік Мінскага завода грамадзянскай авіяцыі заўважыў, што II Гульні краін СНД, якія гэтымі днямі прымае Беларусь, з'яўляюцца падзеяй года не толькі для нашай краіны, а і для ўсёй постсавецкай прасторы. Мужчына заўважыў, што нашы спартсмены вельмі добра падрыхтаваныя, паказваюць выдатныя вынікі. Можа, гэта і ёсць адна з прычын недапушчэння і абмежавання ўдзелу нашых спартсменаў у міжнародных спаборніцтвах, спытаў ён у Прэзідэнта.

Кіраўнік краіны паўтарыў, што ўжо неаднойчы казаў: «Яны баяцца канкурэнцыі, яны паказваюць свой нораў, хочуць нас нахіліць, як заўсёды, яны змагаюцца за сусветнае панаванне — і гэта толькі інструмент. Спорт стаў даўно вялікай палітыкай. Таму цэняць па ўсіх кірунках. Мы вытрымалі, выстаялі. У нас хлопцы і дзяўчаты па ўсіх відах спорту выступаюць і выдаюць добрыя вынікі. Там ужо пад 130 медалёў, па-мойму. Ніколі такога не было. Шчыра кажучы, гэта ж будучыня наша. У асноўным спартсмены выступаюць маладыя, у будучыні сябе яшчэ праявяць і пакажуць. Да таго ж з той 21 дзяржавы, акрамя нас, там жа таксама такія спартсмены, як нашы. Гэта будучыня, і тое, што мы такую велізарную колькасць медалёў заваявалі, — добра».

Прэзідэнт заўважыў, што на спартыўных пляцоўках Гульняў для беларусаў асноўнымі канкурэнтамі з'яўляюцца расіяне. «Мы пакуль да іх не дацягнуліся, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Яны на першым месцы, і залатых медалёў у іх у два або ў тры разы больш. Няма ніякіх праблем для спартсменаў. Ідзіце, трэніруйцеся і выйгравайце. Мы арганізавалі наш удзел ва ўнутраных спаборніцтвах у Расіі, і расіяне

# З ЛЮБОЙ СІТУАЦЫІ НЕ ПАКІНЕМ»

прыязджаюць і ўдзельнічаюць ва ўнутраных спаборніцтвах Беларусі».

І тым, хто спрабуе прыкрывацца санкцыямі, парада ад кіраўніка дзяржавы наступная: «Пра санкцыі мы ўвогуле не разважаем. На гэта не павінны звяртаць увагі. Чалавечая галава такая: калі ты толькі загрузіў сябе санкцыямі, тады і працаваць не трэба. Можна спасылацца, што ў нас санкцыі, цяжка і гэтак далей. А што, ад гэтага вам лягчэй будзе? Таму ніякіх санкцый. Так, няпроста. Так, складана. А калі нам было лягчэй? Заўсёды было складана, бо мы канкурэнты. І нам будзе яшчэ складаней, бо мы ўварваліся ў самую інтэлектуальную і высокатэхналагічную вытворчасць. Але і далей будуць канкурэнты, і мы павінны іх перамагаць».

Кажучы аб падрыхтоўцы спартсменаў, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ён не бачыць тут праблем. «Раней ці пазней яны вымушаныя будуць нас вярнуць у міжнародны чэмпіянат, — падкрэсліў беларускі лідар. — Мы з Пуціным пазаўчора размаўлялі, закранулі і гэтую тэму. Я яго падтрымаў і пахваліў за тое, што ён ініцыяваў спаборніцтвы БРІКС. А гэта Бразілія, гэта Расія, Паўднёвая Афрыка, Кітай і Індыя. Там паўтара мільярда, і там — паўтара мільярда. Калі толькі ў БРІКС, і мы адразу туды далучымся да гэтых спаборніцтваў, многія краіны туды далучацца. І Міжнародны алімпійскі камітэт, алімпійскі рух, які ёсць цяпер (Бах узначальвае), разваліцца. Бо ўсе змагаюцца за грошы — рэклама. А чым больш гледачоў, вось вам і рэклама, вось вам і грошы. Таму яны таксама там не дурні. Яны разумеюць, што яшчэ іх некалькі крокаў — і яны разваляць гэты рух».

Вяртаючыся да нашых спартсменаў, якія ўдзельнічаюць у ІІ Гульнях СНД, Прэзідэнт паўтарыў, што гэта наша будучыня. Аляксандр Лукашэнка дадаў, што яны паказваюць добрыя вынікі. Але галоўнае, на яго думку, што ў міжнародных спаборніцтвах беларускія спартсмены заваёўваюць медалі, што вельмі важна з псіхалагічнага пункту гледжання. Ёсць у кіраўніка дзяржавы пэўныя прэтэнзіі, напрыклад, да барцоў, але з гэтым разбяруцца пасля правядзення Гульняў. «Спорту — быць! — рэзюмаваў беларускі лідар. — Спорт высокіх дасягненняў цягне масавы спорт за сабой. А масавы спорт — гэта мы з вамі, гэта наша здароўе».

Што датычыцца ціску на міжнародных спартыўных пляцоўках, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што вытрымалі і не такое. «На нас ціснуць з сярэдзіны 90-х гадоў мінулага стагоддзя, — нагадаў ён. — Ціснуць, ціснуць, і нам прадракалі смерць, а мы жывём. І калі пачалі ўводзіць гэтыя санкцыі, асабліва супраць Расіі, я Прэзідэнту Расіі кажу: дзякуй богу, што ўвялі гэтыя санкцыі. Цяпер нам неабсяжны край работы. Дай бог сёння асвоіць усё ў Расіі, што трэба: пачынаючы ад харчавання, заканчваючы самалётамі. Вазіць людзей мы будзем. Не пагодзяцца яны, каб мы лялі на Захад — будзем на Усход перамяшчаць людзей. Галоўнае — не спыняцца».

## «У нас будзе свой беларускі аўтамабіль»

Яшчэ адзін супрацоўнік прадпрыемства пацікавіўся ў кіраўніка дзяржавы, ці магчыма павялічыць аб'ёмы вытворчасці аўтамабіля «Джылі», бо аўто беларуска-кітайскай вытворчасці карыстаецца вялікім попытам у насельніцтва. Аб гэтым сведчаць чэргі ахвотных, хто жадае набыць гэты аўтамабіль, які ўжо людзі паміж сабой называюць народным.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў: раней людзі стаялі ў чарзе гадамі, не маглі купіць аўтамабіль. «Дрэнна, што даводзіцца стаяць у чарзе, — з аднаго боку, з другога, я рады, што з'явіўся попыт на гэты аўтамабіль, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Першыя месяцы былі сумненні, але я спадзяваўся, што людзі будуць купляць гэты аўтамабіль. Ён добры, ён наш, і пры ўсіх недахопах (мне прыйшлося часта падключацца да пытанняў рамонту і запчастак) мы ўсё-ткі трымаем гэта на кантролі і будзем прасоўваць гэты аўтамабіль. Мы дамовіліся з кітайцамі аб ліцэнзійнай вытворчасці сваіх аўтамабіляў. Вызначылі, па-мойму, два брэнды. Таму ў нас будзе свой беларускі аўтамабіль. Калі ўжо за гэта зачапіліся, то мы дойдзем да вытворчасці ўласнага, абсалютнага, амаль стопрацэнтнага беларускага аўтамабіля. Якаснага аўтамабіля. Будзем рухацца далей».

## За электратранспартам будучыня

Наступнае пытанне датычылася мадэрнізацыі аўтапарка пасажырскага транспарту. На дарогах нашай краіны ўсё часцей можна заўважыць сучасныя аўтобусы, тралейбусы і трамваі айчыннай вытворчасці. Ці будзе працягвацца такая работа, спыталі ў Прэзідэнта.

Кіраўнік дзяржавы паведаміў, што ў найбліжэйшы час дзесьці каля 150 аўтобусаў і каля 50 тралейбусаў будзе заменена сучаснымі. «Вельмі папулярныя нашы аўтобусы, — пагадзіўся Аляксандр Лукашэнка. — Мы не паспяваем задавальняць патрэбы. Канкурэнты нас пачынаюць прыдушваць, спасылаючыся на тое, што там пажар у аўтобусе ў Піцеры, яшчэ нешта... Цяпер дзяржкамісія працуе. Я накіраваў, каб разабраліся, у чым там пытанне. Гэта жудасная канкурэнцыя, але мы яе вытрымаем. Гэта добрыя, якасныя аўтобусы».

Спыніўшыся на пытанні эксплуатацыі айчынных аўтобусаў, кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ў Беларусі яны не гараць. «Дык у чым пытанне? — пацікавіўся ён. — Ёсць пытанне. Мы будзем за гэтыя рынкі змагацца і будзем змагацца праз якасць».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падзяліўся сваімі назіраннямі. У яго складваецца ўражанне, што хутка насельніцтва краіны не будзе карыстацца грамадскім транспартам. «У нас у Мінску ў сярэднім два аўтамабілі на сям'ю, а некаторыя маюць і тры, і чатыры, — заўважыў ён. — Калі ласка, ездзіце. Хоць паліва будзе каму купляць — паліва ў нас хапае. Дай бог яго зрасходаваць».

У развіццё тэмы транспарту кіраўнік дзяржавы дадаў, што больш актыўна будзем пераходзіць на электратранспарт — у краіне працуе свая атамная электрастанцыя. Прэзідэнт паведаміў, што ў будучым у Беларусі можа з'явіцца другая АЭС. «У нас магутнасці электрычныя залішнія — на вялікую перспектыву, — удакладніў ён. — Можам будаваць заводы, электрааўтамабілі, што і робім, і жыллё з выкарыстаннем электрычнасці. Гэта самы выгадны, самы эфектыўны від паліва. Будзем у гэтым напрамку рухацца. Электратранспарту — быць! Пачынаючы ад легкавога аўтамабіля да аўтобусаў і іншага, я гэтаму ўдзяляю вялікую ўвагу. Даўно пачалі мы гэтым займацца і не пралічыліся».

## «Мы адкрытыя для супрацоўніцтва»

Пілот авіякампаніі «Белавія» запытаўся, ці гатовая наша краіна да змен узаемаадносін з некаторымі краінамі, якія ўвялі супраць беларускага народа шматлікія абмежаванні, і як хутка можна будзе назіраць у мірным беларускім небе замежныя авіякампаніі.

«Хоць заўтра, — адказаў беларускі лідар. — Мы людзі не агрэсіўныя. Яшчэ раз падкрэсліваю: мы ні з кім не збіраемся ваяваць. Я кажу гэта вам пастаянна. Я не хачу, каб пры мне беларусы пачалі ваяваць, бо гэта вялікая загана любога прэзідэнта».

Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на тым, што беларусы — мірныя людзі, якія хочуць з усімі супрацоўнічаць. «На выступленні з нагоды Дня Незалежнасці я аб гэтым казаў, што і з палякамі трэба размаўляць, — нагадаў ён, удакладніўшы, што даў адпаведныя даручэнні ўраду. — Мы суседзі, а суседзяў не выбіраюць, яны ад Бога. У іх 15 кастрычніка, як вядома, асноўныя парламенцкія выбары і, вядома, ім трэба цяпер нагнятаць абстаноўку для таго, каб паказаць, што яны правільна ўзброівалі і пераўзброівалі краіну. Таму да 15 кастрычніка яны наўрад ці пойдуць на нейкія істотныя змены, выгадныя ім і нам. Яны шмат чаго патрабуюць ад нас і просяць, але мы на гэта пайсці не можам, бо гэта супярэчыць нашым інтарэсам».

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што Польшча не сама па сабе нагнятае абстаноўку ў рэгіёне — яе падштурхоўваюць да гэтага Злучаныя Штаты Амерыкі. «Амерыканцы зрабілі стаўку на Польшчу, але палякі — людзі не дурныя, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Гэта нашы людзі, славяне. Яны ўсё цудоўна разумеюць. Пацерпім, паглядзім. Мы адкрытыя для супрацоўніцтва».

Беларускі лідар адзначыў, што цяпер мы жывём перш за ўсё за кошт Усходу — супрацоўнічаем з Расіяй, Кітаем. Але, на думку Прэзідэнта, не трэба забывацца і пра высокатэхналагічны Захад. «Яны побач, яны нашы суседзі — Еўрасаюз, — нагадаў ён. — І адносіны з імі страчваць нельга. Мы да гэтага гатовыя, але з улікам нашых уласных інтарэсаў. Паверце, прыйдзе час (цяпер такая турбулентнасць, кажучы на вашай мове, цяжкасці вялікія), але ў 2024—2025 гадах, я ўпэўнены, адбудуцца сур'ёзныя змены, у свеце ў тым ліку».

## «Мы лячылі і будзем лячыць, падтрымліваць гэтых дзяцей»

Спецыяліст па рабоце з моладдзю Нацыянальнага аэрапорта Мінск выказаў кіраўніку дзяржавы ўдзячнасць, што на Беларусі пануюць мір і дабрабыт, што, на яго думку, дазваляе моладзі ўсебакова развівацца і працаваць на карысць дзяржавы. Малады чалавек родам з Данбаса і добра ведае, што такое голад і абстрэлы. Падзеі, што там адбываюцца, пазбавілі яго самых дарагіх людзей — бацькоў. Супрацоўнік прадпрыемства расказаў, што на беларускай зямлі ён знайшоў родных яму людзей, дастойную работу, дом, дзе адчувае сябе ў поўнай бяспецы, а таму цэніць кожную хвіліну жыцця. Малады чалавек падзякаваў за тое, што Аляксандр Лукашэнка падтрымлівае жыхароў Данбаса, асабліва дзяцей, якія рэгулярна прыязджаюць у Беларусь на аздараўленне, і пацікавіўся, ці плануецца, каб дзеці Данбаса зноў прыязджалі ў нашу краіну.

«Планавалі, плануем і будзем планаваць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — І не толькі планаваць — будзем падтрымліваць дзетак. Вы бачыце, яны прыязджаюць сюды па цішыню. Для іх дзіка быць у краіне і не чуць гэтых выбухаў... І тое, што заходнікі спрабуюць там узбудзіць (спачатку па Пуціну, потым па мне) сітуацыю ў свеце і ледзь не да крымінальнай адказнасці прывесці, гэта проста смешна. Я абсалютна за гэта не перажываю. Наадварот, мы разумеем, што так трэба дзейнічаць. Дзеці ні ў чым не вінаватыя. Мы дамовіліся з Пуціным, што мы будзем з саюзнага бюджэту нашага Беларусі і Расіі фінансаваць гэтыя паездкі — Расія і Беларусь. Мы гэта робім і будзем рабіць».

У сваю чаргу, нядобразычліўцам Аляксандр Лукашэнка параіў разабрацца з рэальнай праблемай вывазу дзяцей з Украіны на Захад, якіх выкарыстоўваюць у якасці донараў. «Дзетак з Украіны вывозяць, расчляняюць і дастаюць органы, і сваіх мярзотнікаў спрабуюць там лячыць, — вось з тымі няхай разбяруцца, — парэкамендаваў беларускі лідар. — Мы лячылі і будзем лячыць, падтрымліваць гэтых дзяцей». Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што гэтым займаецца гераічны чалавек — Аляксей Талай, заснавальнік аднайменнага дабрачыннага фонду.

«Дапаможам мы сёння людзям, Бог гэта бачыць — дзесьці і нам дапаможа. Таму дзяцей будзем падтрымліваць», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

У канцы сустрэчы Прэзідэнт падзякаваў працоўным калектывам за размову і папрасіў прабачэння, што адарваў людзей ад работы. У сваю чаргу, супрацоўнікі выказалі ўдзячнасць кіраўніку дзяржавы за шчыры дыялог і перадалі для музея Палаца Незалежнасці эксклюзіўны штурвал самалёта.

**Вераніка КАНЮТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кітай вярнуў з-за мяжы аднаго са злачынцаў, якія найбольш вышукваліся ў краіне



Аб гэтым паведаміла Цэнтральная камісія КПК па праверцы дысцыпліны і Дзяржаўнага наглядннага камітэта, перадала ТАСС. «Чжоў Цюань, адзін са злачынцаў, якія хаваюцца ад правасуддзя за хабарніцтва, вярнуўся ў Кітай і здаўся ўладам пасля прыкладна васьмі гадоў знаходжання на волі за мяжой», — гаворыцца ў паведамленні камісіі. Удакладняецца, што Чжоў Цюань быў чыноўнікам суднаходнай кампаніі, якая базіруецца ў Даляне (Паўночна-Усходні Кітай). Яго абвінавачваюць у растраце і незаконным прысваенні дзяржаўных сродкаў. Чыноўнік збег за мяжу ў сакавіку 2015-га і быў унесены ў чырвоны апавяшчэнні Інтэрпола ў маі 2016-га. У выніку маштабнай антыкарупцыйнай кампаніі, праведзенай у апошнія гады, многія службовыя асобы, уключаючы высокапастаўленых, пазбавіліся пасад і былі прысуджаныя да турэмных тэрмінаў, у тым ліку пажыццёвых. У мэтах спынення злоўжыванняў у партыйных структурах і ўрадзе ў сакавіку 2018 года ў КНР быў створаны Дзяржаўны наглядны камітэт, надзелены пашыранымі паўнамоцтвамі ў сферы барацьбы з карупцыяй.

### Першая расійская месяцавая місія стартавала з касмадрома Усходні



З касмадрома Усходні стартавала ракета-носьбіт «Саюз-2.1б» з разгонным блокам «Фрэгат» і аўтаматычнай станцыяй «Месяц-25», паведаміў expert.ru са спасылкай на прэс-службу «Раскосмаса». Станцыя ўжо выведзена на траекторыю пералёту да Месяца і ўзята на кіраванне пасля аддзялення ад разгоннага блока. Выхад на калямесячную кругавую арбіту вышынёй сто кіламетраў намячаецца 16 жніўня, пасадка на паверхню натуральнага спадарожніка Зямлі павінна адбыцца 21 жніўня ў раёне, размешчаным на поўнач ад кратара Багуслаўскі. Гэта першы расійскі апарат у сучаснай гісторыі, які адпраўіцца на спадарожнік Зямлі. Усе папярэднія былі адпраўленыя яшчэ ў савецкі перыяд, апошнім з іх быў «Месяц-24», які ў 1976 годзе даставіў на Зямлю ўзор месяцавага грунту.

### Колькасць ахвяр пажараў на Гаваях перавысіла паўсотні чалавек



Сама меней 53 чалавекі загінулі ў выніку лясных пажараў на Гаваях, дзясяткі людзей атрымалі раненні. Аб гэтым са спасылкай на заяву ўладаў акругі Маўі паведаміў CNN. Губернатар штата Джош Грын заявіў тэлеканалу, што колькасць ахвяр можа перавысіць 60 чалавек. Ён прыгадаў цунамі 1960 года, у выніку якога загінуў 61 чалавек. «Баюся, на гэты раз вельмі верагодна, што агульная колькасць загінулых значна перасягне тое», — сказаў ён. Горад Лахайна на заходнім баку вострава Маўі прыняў на сябе асноўны цяжар вогненнага шторму. Паводле ацэнак мясцовых уладаў, з-за стыхіі разбураны або пашкоджаны 271 аб'ект інфраструктуры. Эвакуіраваны тысячы людзей. Барацьбу са стыхіяй ускладняюць спякота і моцныя вятры, прынесеныя ціхаакіянскім ураганам «Дора». Як паведамляецца, мясцовыя аэрапорты перапоўненыя жадаючымі пакінуць астравы, але ўмовы надвор'я прывялі да затрымкі і адмены рэйсаў. Як стала вядома, прэзідэнт ЗША аб'явіў на Гавайскіх астравах «рэжым маштабнага стыхійнага бедства».

# НА ВАРЦЕ ХАРЧОВАЙ БЯСПЕКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яшчэ задоўга да пачатку жніва міліцыя праінспектавала ўсе прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу краіны. Супрацоўнікі органаў унутраных спраў праверылі, наколькі да сезонных работ падрыхтаваная тэхніка, ацанілі ўмовы, створаныя для сушкі і захоўвання збожжавых, зернебабовых і кармавых культур. Указаныя недахопы неабходна было выправіць да старту ўборачнай кампаніі.

Аднак ці ўсе кіраўнікі прадпрыемстваў АПК добрасумленна падрыхтаваліся да найбольш адказнага ў сельскагаспадарчым цыкле перыяду? Гэтым пытаннем задаюцца і праваахоўнікі, якія ўжо паўтора працягваюць інспектаваць мехдвары, фермы і зернесховішчы. З пачаткам уборачнай кампаніі работы ў міліцыянераў стала яшчэ больш — кожны дзень людзі ў пагонах клапоцяцца аб тым, каб сабраны ўраджай быў цалкам захаваны: каб ніводнае зярнятка не было страчана або ўкрадзена.





З такой мэтай на пастаяннай аснове кантралююцца і месцы пражывання механізатараў энерганасычанай тэхнікі.

Для папярэджання правапарушэнняў у сферы АПК органамі ўнутраных спраў рэгулярна праводзяцца рэйдавыя мерапрыемствы. У адзін з такіх рэйдаў разам з супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага райвыканкама накіраваліся і карэспандэнты «Звязды».

## Спраўнасць тэхнікі — пытанне № 1

Як расказаў **намеснік начальніка аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага райвыканкама падпалкоўнік міліцыі Вячаслаў ПАРГАНАЕЎ,** на тэрыторыі прысталічча знаходзіцца 13 сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. У перыяд уборачнай у гаспадарках прызвычаіліся да частых візітаў супрацоўнікаў міліцыі. Гэтым разам праверачныя мерапрыемствы чакалі філіял «Мінскі» ААТ "Агракамбінат «Дзяржынскі»". Прадпрыемства з'яўляецца адным з найбуйнейшых у Мінскім раёне. Спецыялізуецца на вытворчасці мяса птушкі, яго перапрацоўцы і рэалізацыі. Раней гэта была 1-я Мінская птушкафабрыка, якая ўвайшла ў склад буйнога холдынга. Сюды і накіравалася наша рэйдавая інспекцыя.

Аб сваім візіце кіраўніцтва прадпрыемства апавясцілі, але раптоўных праверак, па словах праваахоўнікаў, таксама хапае. У машынна-трактарным парку, куды адразу накіраваліся правяраючыя, шумна — майстры рамантуюць два трактары. Няспраўнасць, па іх словах, нязначная: да вечара трактары зноў адправяцца на палеткі.

— Тая тэхніка, якая задзейнічана на ўборачнай, у вас уся спраўная? — цікавіцца ў **начальніка цэха механізацыі філіяла «Мінскі» Аляксея АКУЛІЧА** супрацоўнік АБЭЗа.

— За выключэннем аднаго камбайна з 23, якія стаяць на балансе гаспадаркі, — адказвае ён. — Але і гэты камбайн на працягу дня будзе падрамантаваны і вернецца на жніво. Калі падчас рамонту механізатару патрэбная дапамога, непаладкі ліквідуюцца ў механізаваным цэху (пры ўмове, калі камбайн знаходзіцца недалёка). Як правіла, рамантуемся ў полі — дзеля гэтых мэт створана выязная група.

Як адзначае **намеснік дырэктара па механізацыі філіяла «Мінскі» ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі» Васіль ШЭЎЧЫК,** натуральна, што падчас работы тэхніка ламаецца, але няспраўнасці аператыўна ліквідуюцца — машыны не прастойваюць. Ён расказаў, што падрыхтоўка пачалася задоўга да ўборачнай. «Тэхніка была дэфектавана ў канцы года, як толькі мы ўбралі з поля кукурузу, — удакладніў намеснік дырэктара гаспадаркі. — Зімой-вясной ажыццяўляўся яе планавы рамонт. Тыдні за два-тры ўсе камбайны прайшлі тэхнічны агляд і былі гатовыя да ўборкі ўраджаю».

Аднак, як высветлілі супрацоўнікі міліцыі, няспраўная тэхніка на прадпрыемстве ўсё ж такі ёсць. Але яна не задзейнічана ва ўборачнай кампаніі, таму прастойванне машын ніяким чынам не ўплывае на ход жніва. «У дадзенага прадпрыемства вельмі вялікая колькасць тэхнікі: яно ўвесь час узбуйнялася тымі гаспадаркамі раёна, якія працавалі нерэнтабельна, — заўважае Вячаслаў Парганаеў. — У спадчыну з неэфектыўнымі прадпрыемствамі 1-й Мінскай птушкафабрыцы дастаўся і іх няспраўны аўтапарк. Але колькасць машын, якім патрэбны рамонт, змяншаецца».

Інспектар звярнуў увагу на транспартныя сродак, які ў разабраным выглядзе стаяў на адной з пляцовак прадпрыемства. Як высветлілася, грузавік рамонту не падлягае і спісаны з балансу. «Здыміце з тэхнікі тое, што яшчэ можна выкарыстаць, астатняе размясціце на пляцоўцы для металалому, — у такім выглядзе машына тут не павінна знаходзіцца, — зрабіў заўвагу Вячаслаў Парганаеў і вынес рэкамендацыі: — Самае галоўнае, каб тэхніка не стаяла. Калі можна яе выкарыстаць — выкарыстоўвайце. Калі захады па аднаўленні рабіць не ўдаецца, перапрадайце іншым прадпрыемствам. Зразумела, што за кароткі час (у пачатку ліпеня мы праводзілі маніторынгавыя мерапрыемствы па вывучэнні колькасці сельскагаспадарчага транспарту, яго тэхнічнага стану) разабрацца з усёй няспраўнай тэхнікай складана. Мы павінны бачыць, што канкрэтна было зроблена для рамонту той ці іншай адзінкі, што спісана на металалом, а што прададзена. Разабраныя машыны, безгаспадарліва кінутыя запчасткі ствараюць умовы для крадзяжу, а гэтага дапусціць нельга».

## На ўліку — кожны літр

Рэйдавая група накіравалася на запраўачную станцыю, якая знаходзіцца на тэрыторыі машынна-трактарнага парка. Вячаслаў Парганаеў запрасіў дакументацыю па сённяшняй запраўцы аўтатранспартных сродкаў. Вывучыўшы запісы, супрацоўнік міліцыі ўдакладніў, ці ўсе машыны запраўляюцца там. Аказалася, што не ўсе. Некаторая тэхніка (у прыватнасці, камбайны) для таго, каб сэканоміць час, ажыццяўляе запраўку адразу ў полі — дзеля гэтага выязджае бензавоз.

— А тут хто запраўляецца? — пытаецца падпалкоўнік міліцыі.

— У асноўным, трактары, пагрузчыкі, — кажа Аляксей Акуліч. — Як тут, так і ў полі запраўка ажыццяўляецца толькі ў прысутнасці супрацоўнікаў нашай службы бяспекі.

Асноўнае пытанне, на якое на запраўачнай станцыі звярнулі ўвагу інспектары, — мэтавае выкарыстанне паліва. На запраўцы ўстаноўлена сістэма відэаназірання, таму несанкцыянавана зліць паліва ў каністру або папоўніць бак уласнага транспартнага сродку нерэальна. Працэс, які адбываецца на запраўачнай станцыі, са свайго кабінета ў рэжыме рэальнага часу бачыць кіраўнік гаспадаркі.

Дзеля папярэджання крадзяжу паліва рэгулярна ў поле выязджаюць і супрацоўнікі службы бяспекі прадпрыемства. Праверыць, ці не «згубіў» па дарозе ў поле трактар або грузавік дзясятак-другі літраў, няцяжка і супрацоўнікам аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі. Усё гэта лёгка пракантраляваць, маючы на руках дарожны ліст, які пасля запраўкі выдаецца кіроўцу машыны, і ўбачыўшы лічбы на табло спідометра. Дзякуючы сістэме GPS-навігацыі, устаноўленай на вялікагабарытнай тэхніцы, факт крадзяжу паліва ўстанавіць увогуле проста.

Калі ж у механізатара на месцы жыхарства ці яшчэ ў нейкім месцы будзе выяўлена афарбаванае паліва (такое паліва знаходзіцца толькі на балансе сельгаспрадпрыемстваў), то за крадзеж трэба будзе адказваць па законе. Не пазбегне адказнасці і старонні чалавек, які захоўвае афарбаваныя літры. На прадпрыемствах Мінскага раёна міліцыянерамі ўжо выяўлены факты дробных крадзяжоў паліва. Дзеянням нядобрасумленных супрацоўнікаў даецца прававая ацэнка.

## Парадак і дысцыпліна

Трапіць на зернесушыльны комплекс гаспадаркі хутка і бесперашкодна не атрымалася. Служба бяспекі прадпрыемства пацікавілася ў нас мэтай візіту і запатрабавала дакументы, якія пацвярджаюць асобу. Павышаныя меры бяспекі накіраваны перш за ўсё на папярэджанне несанкцыянаванага доступу да харчовых запасаў. Толькі пасля таго, як кіраўніцтва прадпрыемства пацвердзіла мэту рэйдавага мерапрыемства і нас сустрэў прадстаўнік комплексу, мы апынуліся каля гор збожжа чорнага і жоўтага колеру — да сушкі рыхтаваліся чарговыя партыі прывезеных рапсу і жыта.

У начальніка цэха захоўвання прадукцыі раслінаводства інспектар пацікавіўся, як вядзецца ўлік збожжа, калі машыны прыбываюць з палёў. Васіль Канопліч расказаў, што ў спецыяльным журнале фіксуецца, колькі (у тонах) зерня прывозіцца, таксама ўказваецца яго вільготнасць, якая вымяраецца на месцы.

Вячаслаў Парганаеў недакладнасцяў у дакументацыі не выявіў, але пацікавіўся, наколькі аб'ектыўна фіксуецца вільготнасць збожжа. Пераканацца ў правільнасці запісаў інспектару прапанавалі адразу на месцы. Начальнік цэха набраў у спецыяльны прыбор прывезенае нядаўна зерне. Лічба практычна супала з той, якая была запісана ў журнале. Як заўважаюць спецыялісты, невялікая недакладнасць у падліках дапускаецца: калі браць зерне ў розных месцах з адной партыі збожжа, вільготнасць можа адрознівацца.



— Галоўнае, каб на зернесушыльных комплексах вёўся належны ўлік збожжа, усе ўстройствы былі спраўныя, на самім комплексе захоўвалася чысціня, — абазначыў прыярытэтныя кірункі інспекцыі ў згаданай лакацыі намеснік начальніка аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага райвыканкама. — Асноўная ж задача прадпрыемства — выканаць дзяржаўны заказ па збожжавых і забяспечыць сябе кармамі на цэлы год. Дасягнуць гэтага можна, калі ва ўсім будзе парадак. Пры яго ўмове гаспадарка правядзе ўборку ў тэрмін і не дапусціць страты ўраджаю.

Як расказаў **намеснік генеральнага дырэктара па сельскай гаспадарцы ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі» Віталь ГРЫШАНАЎ,** надвор'е дазваляе перапрацоўваць, але не дазваляе на поўную магутнасць запусціць камбайны. «Прадпрыемствы агракамбіната знаходзяцца ў сямі раёнах Мінскай вобласці: Дзяржынскім, Стаўбцоўскім, Мінскім, Крупскім, Валожынскім, Капыльскім і Слуцкім, — заўважыў ён. — Мы вырошчваем усю лінейку сельгаскультур, за выключэннем бульбы, іншай гародніны і лёну. Практычна ўвесь ураджай прапускаем праз птушкагадоўлю і жывёлагадоўлю. Мы поўнасцю забяспечваем сябе кармамі».

Умовам захоўвання збожжа, зернебабовых і кармавых культур — асаблівая ўвага з боку праваахоўных органаў. «Памяшканні, у якіх захоўваецца сабраны ўраджай, тэхніка, павінны быць пад замком, — звяртае ўвагу Вячаслаў Парганаеў. — У сховішчах праводзіцца асвятленне, памяшканні забяспечваюцца вартаўніком. Рэкамендуем, каб кіраўніцтва прадпрыемства ўзаемадзейнічала з Дэпартаментам аховы МУС. Сярод работнікаў павінны быць жалезная дысцыпліна, адказнае стаўленне да сваіх абавязкаў».

Як звярнуў увагу **дырэктар філіяла «Мінскі» ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі» Максім ХАЦЬКО,** пільны кантроль за дзейнасцю прадпрыемства ў перыяд уборачнай кампаніі з боку органаў унутраных спраў з'яўляецца важным складнікам гарантавання харчовай бяспекі краіны. «Падобныя праверкі не даюць расслабіцца, прымушаюць паглядзець на рэчы па-іншаму, аб'ектыўна ацаніць сітуацыю», — лічыць кіраўнік гаспадаркі.

Аб'язджаць з інспекцыяй усе палі, на якіх вядуць уборачныя работы механізатары прадпрыемства, мы не сталі. Выбарачна праінспектавалі некалькі ўчасткаў. Тэхніка працуе, людзі задзейнічаны. Толькі на адным полі адначасова ўдалося назіраць у рабоце шэсць камбайнаў. «Супрацоўнікі прадпрыемства сапраўды займаюцца ўборачным працэсам, тэхніка не прастойвае — у зман кіраўніцтва гаспадаркі нас не ўвяло», — рэзюмаваў Вячаслаў Парганаеў. Як выконваюцца дадзеныя падчас рэйдавага мерапрыемства даручэнні, у хуткім часе будзе праверана.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

*Мінскі раён.*

Афіцыйна

# Зацверджаны эмблема і сцяг Міністэрства ўнутраных спраў

**Адпаведны Указ — № 246 «Аб афіцыйных геральдычных сімвалах Міністэрства ўнутраных спраў» — 7 жніўня падпісаў кіраўнік дзяржавы.**

Эмблема і сцяг міліцэйскага ведамства заснаваныя з мэтай захавання і развіцця гістарычных традыцый, умацавання аўтарытэту органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў, павышэння прэстыжу службы. Указам зацверджаны палажэнні аб эмблеме і сцягу МУС, іх апісанні і выявы.







Падрабязнасці

# ЭСТАФЕТА ПАЗІТЫЎНЫХ ЭМОЦЫЙ

## Падчас II Гульняў краін СНД міліцыянеры забяспечваюць грамадскі парадак і ствараюць добры настрой

**Гэтымі днямі Беларусь прымае II Гульні краін СНД. Сярод тых, хто адказвае за бяспеку на спартыўным форуме (ён праходзіць у дзесяці гарадах краіны), супрацоўнікі органаў унутраных спраў. Іх работа практычна нябачная, але робіцца многае для таго, каб спартсмены, а таксама іх заўзятары адчувалі сябе на беларускай зямлі максімальна спакойна і абаронена.**

Аднак не толькі за захаванне грамадскага парадку адказваюць міліцыянеры. Для жыхароў і гасцей краіны падрыхтавана забаўляльная праграма з прафілактычным ухілам. У дзесяці гарадах, дзе праходзяць спаборніцтвы, размясціліся пляцоўкі акцыі Міністэрства ўнутраных спраў «За бяспеку — разам!». Падчас наведвання ведамасных лакацый кожны можа пагутарыць з супрацоўнікамі органаў унутраных спраў, пазнаёміцца з выставай тэхнікі і ўзбраення, сфатаграфавацца з роставымі лялькамі ў міліцэйскай форме. Акрамя таго, тут можна ўбачыць конны патруль, супрацоўнікаў міліцыі на сегвэях і электратранспарце, паласавацца смачнай кашай і павітацца з талісманам акцыі Сцяпанычам.

### З увагай да дзяцей

Галоўная пляцоўка акцыі МУС «За бяспеку разам!» працуе каля сталічнага Палаца спорту. Супрацоўнікі органаў унутраных спраў, якія арганізавалі лакацыі для мінчан і гасцей горада ў мінулыя выхадныя, працягваюць прымаць наведвальнікаў заўтра. У тым, што міліцэйская лакацыя карыстаецца папулярнасцю ў мінчан і гасцей сталіцы, можна пераканацца з першых хвілін. Дзеці і дарослыя з задавальненнем знаёмяцца з сімвалам акцыі — Сцяпанычам. Дарэчы, гэтае імя выбралі інтэрнэт-карыстальнікі. Хлапчукі ўсіх узростаў канцэнтруюцца каля выставы рэтра- і сучаснай тэхнікі, самастойна складаюць фотаробат і спрабуюць знімаць адбіткі пальцаў: сваю дактакарту можна атрымаць на памяць. Пляцоўка адметная тым, што прысутныя могуць не толькі паспрабаваць сябе ў ролі міліцыянераў, а і атрымаць каштоўную інфармацыю аб правілах бяспекі з першых вуснаў. Супрацоўнікі розных службаў цэнтральнага апарату МУС, сталічнай міліцыі і ўстаноў адукацыі з задавальненнем даюць кампетэнтныя адказы на любыя пытанні. Гэтым ужо актыўна карыстаюцца будучыя абітурыенты і іх бацькі — цікавяцца ўмовамі паступлення і вучобы ў Акадэміі і Спецыялізаваным ліцэі МУС, размаўляюць з курсантамі, ліцэістамі і выкладчыкамі.

Адныімі з першых гасцей галоўнай міліцэйскай пляцоўкі сталі міністр унутраных спраў Іван Кубракоў, яго намеснікі Генадзь Казакевіч і Дзмітрый Карзюк, начальнік галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама Міхаіл Грыб. Кіраўнікі міліцэйскага ведамства праінспектавалі ахову грамадскага парадку на тэрыторыі каля Палаца спорту. Іван Кубракоў пагутарыў з супрацоўнікамі і азнаёміўся з ведамаснай лакацыяй.

— Імкнёмся ў тым ліку ў гульнявой форме растлумачыць нашым грамадзянам, гасцям краіны асаблівасці заканадаўства, а таксама данесці правілы паводзін у грамадскіх месцах, асновы дарожнай бяспекі, — адзначыў **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ**, кажучы аб акцыі МУС «За бяспеку — разам!». — Актыўна працуем і з дзецьмі. І гэта дае вынік — скарацілася колькасць непаўналетніх, якія загінулі на дарогах.

Ацэньваючы аператыўную абстаноўку ў краіне падчас Гульняў, кіраўнік міліцэйскага ведамства адзначыў, што ў беларускай міліцыі ёсць велізарны досвед забеспячэння грамадскага парадку на буйных спартыўных і іншых масавых мерапрыемствах. «Пры гэтым да кожнага з іх мы рыхтуемся вельмі ўважліва, вывучаем навацыі іншых дзяржаў, улічваем аператыўнае становішча ў краіне і тое, што адбываецца вакол нашых граніц, — падкрэсліў ён. — Так, пры ажыццяўленні кантрольна-прапускнога рэжыму на спартыўныя аб'екты ўводзяцца пэўныя абмежаванні, але ўсе яны ў першую чаргу накіраваны на карысць самых грамадзян».

Як звярнуў увагу кіраўнік міліцэйскага ведамства, для бяспекі беларусаў і гасцей краіны зроблена ўсё. Больш за сем тысяч відэакамер працуе ў сістэме маніторынгу грамадскай бяспекі. Любое парушэнне грамадскага парадку — і супрацоўнікі міліцыі адразу рэагуюць. «Пастараліся арганізаваць службу так, каб наша прысутнасць была мінімальнай, пры гэтым сітуацыя цалкам кантралявалася, — удакладніў ён. — Прыняты ўсе неабходныя меры, бяспека забяспечана як на аб'ектах Гульняў, так і ў цэлым па краіне».



### Фантан эмоцый

Падобныя лакацыі да II Гульняў краін СНД беларускія міліцыянеры падрыхтавалі ў рэгіёнах. У Гомелі людзі ў пагонах прапаноўвалі дзецям і моладзі вытрымаць экзамен кіроўцы, атрымаць біяметрычныя дакументы, навучыцца абыходзіць пасткі кіберзлачынцаў і шмат што яшчэ. Інтэрактыўная пляцоўка праваахоўнікаў разгарнулася каля гомельскага Лядовага палаца спорту. Гэтая лакацыя ў фан-зоне Гульняў стала адной з самых папулярных сярод сем'яў з усіх раёнаў Гомеля, гасцей горада, спартсменаў — удзельнікаў спаборніцтваў.

Супрацоўнікі ўпраўлення ДАІ Гомельскага аблвыканкама падрыхтавалі фотазону і дзіцячую пляцоўку з рознымі гульнямі, конкурсамі, заданнямі. Уразіла наведвальнікаў выстава рэтрамашын, што ў розныя гады знаходзіліся на ўзбраенні супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі. Ацаніць можна было і сучасны аўтатранспарт, на якім цяпер нясуць службу вартавыя дарог. Сюрпрызам для дзяцей стала прапанова ад праваахоўнікаў размаляваць спецыяльнымі фарбамі службовы аўтамабіль ДАІ.

— Кожны мог пакінуць на памяць малюнак або адбітак далоні, — расказала **часова выконваючая абавязкі начальніка аддзялення па агітацыі і прапагандзе УДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама Дар'я ТКАЧОВА**. — Прапаноўвалі дзецям намаляваць што-небудзь, з чым у іх асацыіруюцца II Гульні краін СНД. Дзеці малявалі нацыянальны сцяг, васількі, пакідалі розныя пажаданні. Малых і іх бацькоў перапаўнялі эмоцыі.

Асаблівай папулярнасцю ў юных наведвальнікаў пляцоўкі карысталася гульня «хадзілка», якая дапамагае праверыць веданне Правілаў дарожнага руху. Таксама дзеці атрымалі магчымасць уявіць сябе вартавымі закона: прымераць форму супрацоўніка праваахоўных органаў і на хвіліну адчуць сябе ў ролі міліцыянера або інспектара ДАІ.

— Кожнае дзіця атрымала ўнікальную магчымасць стаць уладальнікам першага ў сваім жыцці вадзіцельскага пасведчання, — удакладніла Дар'я Ткачова. — Каб вытрымаць экзамен, неабходна было правільна вырашыць тэст на веданне Правілаў дарожнага руху. Пасля праходжання іспыту дзеці атрымалі кожны вадзіцельскае пасведчанне са сваёй фатаграфіяй на права кіравання веласіпедам.

Захапленне ў наведвальнікаў пляцоўкі гомельскіх праваахоўнікаў выклікалі і паказальныя выступленні міліцыянераў-кінолагаў абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы. На «выдатна» здаў экзамен на рабоце на маштабным мерапрыемстве службовы сабака — бельгійская аўчарка Азур.



— Яму няма яшчэ двух гадоў, толькі адаптуецца да службы, — расказаў аб сваім сабаку-напарніку **малодшы інспектар-кінолаг Гомельскага абласнога Дэпартамента аховы Міхаіл АКСАМІТАЎ**. — Вельмі цікава і дзецям, і дарослым, ці складана выхаваць службовага сабаку. Адказваю, што трэба мець жалезныя нервы. Рыхтуюць службовых сабак у нашым падраздзяленні для агульнай спецыфікі работы: гэта пошук зніклых, прылад злачынства, затрыманне злачынца.

Супрацоўнікі аддзялення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці аддзела ўнутраных спраў адміністрацыі Чыгуначнага раёна Гомеля прапанавалі наведвальнікам пляцоўкі навучыцца распазнаваць злачынцу ў сеціве, правільна рэагаваць на пасткі махляроў. «Прадстаўляем інтэрактыўны вэб-сайт, створаны ў рамках канструктара сайтаў, на якім могуць праходзіць тэсціраванне як дзеці, так і дарослыя, — растлумачыў **супрацоўнік аддзялення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці АУС адміністрацыі Чыгуначнага раёна Гомеля Аляксей МАЛАДЗЯНАЎ**. — У пытаннях тэста змадэляваныя сітуацыі, якія здараюцца ў інтэрнэце і звязаныя з дзеяннямі ашуканцаў. Тэсты вучаць правільна распазнаваць небяспечную сітуацыю, як на яе рэагаваць, каб не стаць ахвярай злачынцаў.

Падчас іх праходжання, калі дзіця ці дарослы чалавек памыліліся, яны могуць самі разабрацца і знайсці правільны адказ, скарыстаўшыся брашурамі, якія падрыхтавалі праваахоўнікі. Многія ўдзельнікі акцыі адзначаюць, што ўжо сутыкаліся з гэтай тэмай на прафілактычных гутарках у школе.

Цікава і пазнаваўча распавесці непаўналетнім аб важнай для кожнага грамадзяніна краіны інфармацыі — такую задачу для сябе на інтэрактыўнай пляцоўцы паставілі супрацоўнікі ўпраўлення па грамадзянстве і міграцыі Гомельскага аблвыканкама. Падрыхтавалі брашуры, якія тлумачаць, што такое біяметрычныя пашпарты і ідэнтыфікацыйныя карткі, для чаго яны патрэбныя, як іх атрымаць і выкарыстоўваць. Для нагляднай дэманстрацыі супрацоўнікі прадставілі мабільны комплекс для збору біяметрычных і ідэнтыфікацыйных звестак грамадзян.

«Гэтае абсталяванне прымяняецца для аказання паслуг грамадзянам, якія з пэўных прычын не могуць самі прыбыць у падраздзяленні па грамадзянстве і міграцыі», — звярнуў увагу **вядучы спецыяліст упраўлення па грамадзянстве і міграцыі УУС Гомельскага аблвыканкама Ігар СТОМА**. — Выкарыстоўваецца мабільны комплекс для работы з людзьмі з інваліднасцю або грамадзянамі, якія знаходзяцца ў інтэрнатных установах. Прыбор дазваляе на месцы чалавека сфатаграфаваць, сабраць адбіткі пальцаў, узор яго подпісу».

На інтэрактыўнай пляцоўцы наведвальнікі таксама даведаліся, як паступіць у ведамасныя навучальныя ўстановы. Сваімі ўражаннямі ад вучобы і аб першых працоўных буднях дзяліліся і праваахоўнікі, якія толькі заступілі на службу. «Вельмі добрая акцыя, дзе змаглі аб сваёй рабоце расказаць супрацоўнікі розных падраздзяленняў, — лічыць **участковы інспектар міліцыі аддзела аховы грамадскага парадку міліцыі грамадскай бяспекі АУС адміністрацыі Чыгуначнага раёна Гомеля Аляксандр САФРОНАЎ**. — Па зацікаўленасці дзяцей відаць, хтосьці абавязкова абярэ прафесію праваахоўніка».



**Вераніка КАНЮТА,**
**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота прэс-службы МУС і Наталлі КАПРЫЛЕНКІ.**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Криница»**

Аукцион состоится **28.08.2023 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1:**
Машина стиральная Л-10-211, инв. № 12297.
Начальная цена с НДС 20 % – 2 496,00 руб. Задаток – 400,00 руб.

**Лот № 2:**
Пресс гладильный КР-516, инв. № 12396.
Начальная цена с НДС 20 % – 7 200,00 руб. Задаток – 1 000,00 руб.

**Место нахождения Лотов № 1 и № 2:**
г. Минск, ул. Радиальная, 52. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – 24.08.2023 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

**Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды объекта недвижимости – здания ТП 1, находящегося в собственности Республики Беларусь и хозяйственном ведении РУП "Гомельское отделение Белорусской железной дороги"**

**Дата проведения аукциона: 05 сентября 2023 г. в 10.00.**
**Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 2-7.**

| № лота | Наименование объекта аренды, цель его использования | Арендуемая площадь, (м²) |
|---|---|---|
| 1 | **Здание ТП 1 с инв. № 342/С-26544** (для организации розничной торговли, размещения офиса, оказания услуг (в том числе автосервиса), для использования под складские помещения) | **132,8** |

**Местонахождение объекта аренды:** Гомельская обл., Светлогорский р-н, г. Светлогорск, пер. Авиационный, 1/8

**Начальная цена продажи права заключения договора аренды: 392,76 руб. Задаток: 392,76 руб.**
**Коэффициент** к базовой ставке арендной платы в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду составляет **2.**
**Срок договора аренды: 3 года, начиная со дня заключения договора аренды. Шаг аукциона: 5 %**

**Местонахождение организатора аукциона, его контакты:**
г. Гомель, ул. Артёма, 23, тел.: +375 232 32-46-47, 32-18-95, +375 29 170-46-47, сайт: www.ino.by, e-mail: gomel@ino.by.

**Извещение о проведении аукциона опубликовано 11.08.2023 г. на официальном сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и официальных сайтах Гомельского областного исполнительного комитета gomel-region.by и Организатора торгов ino.by**

Считать свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя МАРТЫНЕНКО Ольги Леонидовны (УНП 193280957) **недействительным в связи с его утерей.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении **15 сентября 2023 года** торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

**Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)**

| № предмета торгов | Наименование имущества | Год выпуска | Инвентарный номер | Номер шасси | Начальная цена, бел. руб., без учета НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Автокран МАЗ-6303А3 | 2008 | 4253969 | Y3M6303A380000492 | 218 946,06 | 21 890,00 |
| 2 | Автокран МАЗ-533702 КС 3579 | 2007 | 4253069 | Y3M53370270008926 | 81 461,28 | 8 140,00 |
| 3 | Полуприцеп МАЗ-975830 3016-002 | 2008 | 5003806 | Y3M97583080003499 | 35 155,32 | 3 510,00 |
| 4 | Полуприцеп МАЗ-975830 3016М | 2008 | 5003732 | Y3M97583080003301 | 31 545,54 | 3 150,00 |
| 5 | Полуприцеп МАЗ-975830 3016М | 2008 | 5003736 | Y3M97583080003311 | 31 583,28 | 3 150,00 |
| 6 | Полуприцеп МАЗ-975830 3016 | 2006 | 5003615 | Y3M97583060001584 | 10 255,08 | 1 020,00 |
| 7 | Полуприцеп МАЗ-975830 3016-001 | 2007 | 5003725 | Y3M97583070002241 | 28 420,26 | 2 840,00 |
| 8 | Полуприцеп МАЗ-975830 3016-002 | 2008 | 5003805 | Y3M97583080003479 | 35 155,32 | 3 510,00 |
| 9 | Полуприцеп МАЗ-975830-3012 | 2006 | 5003558 | Y3M97583060001161 | 10 027,62 | 1 000,00 |
| 10 | Полуприцеп МАЗ-975830-3016 | 2006 | 5003618 | Y3M97583060001615 | 12 037,02 | 1 200,00 |
| 11 | Полуприцеп МАЗ-975830-3111Р | 2008 | 5003920 | Y3M97583080003140 | 50 821,50 | 5 080,00 |
| 12 | Полуприцеп МАЗ-975830-3012 | 2005 | 5003452 | Y3M97583050000562 | 7 941,72 | 790,00 |
| 13 | Автомобиль МАЗ-544019-1421-031 | 2013 | 5004394 | Y3M544019D0000493 | 142 478,70 | 14 240,00 |
| 14 | Автомобиль МАЗ-544019-1421-031 | 2013 | 5004432 | Y3M544019D0000389 | 134 616,54 | 13 460,00 |
| 15 | Автомобиль МАЗ-544019-1421-031 | 2013 | 5004343 | Y3M544019D0000434 | 129 473,70 | 12 940,00 |
| 16 | Автомобиль МАЗ-544019-1421-031 | 2013 | 5004418 | Y3M544019D0000498 | 144 626,82 | 14 460,00 |
| 17 | Автомобиль МАЗ-544019 | 2013 | 5004479 | Y3M544019D0000465 | 161 722,02 | 16 170,00 |
| 18 | Автомобиль МАЗ-5440Е9-520-032 | 2013 | 5004395 | Y3M5440E9D0000214 | 149 169,90 | 14 910,00 |
| 19 | Автомобиль МАЗ-5440А8-360-031 | 2010 | 5003930 | Y3M5440A8A0002009 | 76 998,78 | 7 690,00 |
| 20 | Автомобиль МАЗ-5440А8-360-031 | 2013 | 5004296 | Y3M5440A8D0003288 | 62 795,28 | 6 270,00 |
| 21 | Автомобиль МАЗ-5440А8-360-031 | 2012 | 5004295 | Y3M5440A8C0003278 | 62 795,28 | 6 270,00 |
| 22 | Автомобиль МАЗ-5440В9 | 2012 | 5004192 | Y3M5440B9C0000061 | 86 743,86 | 8 670,00 |
| 23 | Автомобиль МАЗ-5440В9 | 2008 | 5004022 | Y3M5440B980000001 | 17 748,00 | 1 770,00 |
| 24 | Автомобиль МАЗ-5440В9 | 2013 | 5004316 | Y3M5440B9D0000088 | 120 144,78 | 12 010,00 |
| 25 | Автомобиль МАЗ-5440W8 | 2011 | 5004199 | Y3M5440W8B0000021 | 42 506,46 | 4 250,00 |
| 26 | Автомобиль МАЗ-643087 | 2011 | 5004209 | Y3M643087B0000021 | 59 266,08 | 5 920,00 |
| 27 | Полуприцеп МАЗ-975830-3021 | 2013 | 5004263 | Y3M975830D0005963 | 52 883,94 | 5 280,00 |
| 28 | Полуприцеп МАЗ-975830-3012 | 2012 | 5004288 | Y3M975830C0005780 | 51 732,36 | 5 170,00 |
| 29 | Полуприцеп МАЗ-931010-3011 | 2013 | 5004480 | Y3M931010D0000306 | 49 898,40 | 4 980,00 |
| 30 | Автомобиль МАЗ-5440А9 320 031 | 2012 | 5004194 | Y3M5440A9C0002699 | 50 202,36 | 5 020,00 |
| 31 | Полуприцеп МАЗ-975830 3016М | 2008 | 5003734 | Y3M97583080003306 | 25 943,70 | 2 590,00 |

**Местонахождение имущества:**
г. Минск, ул. Промышленная, 2 (предметы торгов №№ 1–29), г. Минск, пер. Промышленный, 7 (предметы торгов №№ 30–31)

Продавец имущества: ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, код платежа – 40901, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 15.09.2023 по предмету торгов №__.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **15 сентября 2023 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 14.08.2023 по 12.09.2023** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:** (017) 360-42-22 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 395-62-96 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
## ПО ОБЪЕКТУ СТРОИТЕЛЬСТВА
## «Квартал жилой застройки в районе ул. Выготского в г. Минске». Жилой дом № 14 по генплану

*Информация о застройщике:* ***государственное производственное объединение «Минскстрой»*** *(далее – ГПО «Минскстрой») 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 13а;*
*режим работы: пн–чт – 8.30 до 17.45, пт – 8.30 до 16.30, перерыв 13.00–14.00;*
*тел.: 8 (017) 327-52-36, 8 (017) 226-03-01, 8 (029) 195-18-21.*
*Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.*

**Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3 лет, предшествующих опубликованию настоящей проектной декларации, с указанием фактических сроков строительства:**
- жилой дом № 12 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: ноябрь 2019 г. – январь 2021 г.;
- жилой дом № 14 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: февраль 2020 г. – июнь 2021 г.;
- жилой дом № 16 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: апрель 2020 г. – январь 2021 г.;
- жилой дом № 18 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: декабрь 2019 г. – январь 2021 г.;
- жилой дом № 24 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: февраль 2020 г. – июнь 2021 г.;
- жилой дом № 28 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: апрель 2020 г. – июнь 2021 г.;
- жилой дом № 30 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: март 2020 г. – январь 2021 г.;
- жилой дом № 32 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: апрель 2020 г. – июнь 2021 г.;
- жилой дом № 46 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: октябрь 2021 г. – октябрь 2022 г.;
- жилой дом № 38 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: октябрь 2021 г. – октябрь 2022 г.;
- жилой дом № 115 по ул. Притыцкого, фактические сроки строительства: октябрь 2020 г. – сентябрь 2022 г.
- жилой дом № 113 по ул. Притыцкого, фактические сроки строительства: июль 2021 г. – май 2023 г.;
- жилой дом № 42 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: июнь 2022 г. – июнь 2023 г.
- жилой дом № 44 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: июнь 2022 г. – июнь 2023 г.

**Цель строительства:**
объекты долевого строительства строятся для личных нужд дольщиков.

**Сведения о месте нахождения объекта строительства:**
земельный участок для строительства расположен в Центральном районе г. Минска, в районе улиц Выготского и Павлины Меделки. С западной стороны участок ограничен улицей Павлины Меделки, с северной, южной и восточной сторон – землями сельскохозяйственного назначения.

**Строительство осуществляется на основании:**
- решения Мингорисполкома от 25.05.2023 № 2021 «Об разрешении строительства объекта»;
- проектно-сметной документации, разработанной на основании акта выбора места размещения земельного участка от 21.04.2021, утвержденного председателем Мингорисполкома 14.05.2021;
- заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 03.04.2023 № 150-15/23 (положительное);
- свидетельства (удостоверение) № 500/2001-1155 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 22.05.2023, площадью 7,7202 га;
- договора строительного подряда на строительство объекта от 20.06.2023 № 286с-06-23, заключенного с УП «Минскметрострой»;
- извещения о получении уведомления о производстве строительно-монтажных работ и регистрации объекта строительства, выданного инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску на объекте строительства многоквартирного жилого дома, зарегистрированном 21.06.2023 № 2-209Ж-020/23.

**Сведения об этапах строительства и сроках его реализации:**
срок начала строительства объекта – 21 июня 2023 года.

Нормативная продолжительность строительства объекта 14,0 месяцев.

Планируемый срок завершения застройщиком строительства объекта и ввода в эксплуатацию в соответствии с проектной документацией – 20 августа 2024 года.

**Характеристика объекта строительства:**
проектом предусмотрено строительство 3-секционного 19-этажного 225-квартирного жилого дома в конструкциях серии 24РС-1.19, с техническим подпольем, теплым чердаком, плоской кровлей и внутренним водостоком.

Квартиры предусмотрены полной планировкой, организованы жилые комнаты, прихожие, кухни, санузлы, ванные комнаты, летние помещения. В жилых комнатах и кухнях предусмотрено естественное освещение.

Наружные стены надземной части здания запроектированы из трехслойных железобетонных панелей, внутренние стены, перегородки – из железобетонных панелей, блоков ячеистого бетона.

Мусоропровод в жилом доме отсутствует.

Окна, балконные двери – профиль ПВХ с двухкамерными стеклопакетами, оснащены детскими замками безопасности.

Двери – металлические, деревянные.

Элементы остекления лоджий – профиль ПВХ.

**Внутренняя отделка:**
жилые комнаты, прихожие, кухни в квартирах:
потолок – покраска акриловой краской; стены – оклейка обоями, покраска акриловыми красками; покрытие полов – ламинат.

Санузлы, ванные: потолок, стены – окраска акриловой краской; покрытие полов – керамическая плитка.

**Количество объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров:**
договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться на 225 квартир с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, по месту работы, по направлениям в соответствии с решением Мингорисполкома от 25.05.2023 № 2021 «Об разрешении строительства объекта».

**Цены на объекты долевого строительства:**
стоимость строительства 1 квадратного метра общей площади объектов долевого строительства с выполнением внутренних отделочных работ в текущих ценах для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, составляет 2 221,77 руб.

**Сведения о составе общего имущества жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию жилого дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам:**
- в состав общего имущества жилого дома входят межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, чердак, и другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых помещений, помещение товарищества собственников.

**Условия ознакомления с объектами долевого строительства и ходом работ по ним:** ознакомиться можно в офисе застройщика ГПО «Минскстрой».

Заявления о заключении договоров будут приниматься (регистрироваться) через 2 календарных дня после опубликования декларации непосредственно от граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, по месту работы, при наличии соответствующего направления, справки о состоянии на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий (**выданной не позднее 30 календарных дней на момент ее предоставления, со сверкой учетных данных**), и паспорта гражданина, с которым будет заключаться договор. Договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования декларации по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105 с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

# НЕ ЧАПАЙЦЕ ЗВЯРЫНЫХ ДЗІЦЯНЯТ!

## НЕ МЕСЦА ДЛЯ ФОТАСЕСІІ

Акурат дзесяць гадоў споўнілася, як у Камянецкім раёне бабёр напаў на чалавека, перакусіў артэрыю, у выніку мужчына загінуў. Трое сяброў вярталіся з рыбалкі, на ўзбочыне дарогі яны заўважылі бабра. Адзін падышоў бліжэй да дзікага звера і хацеў сфатаграфавацца, а бабёр раптам накінуўся і ўкусіў. Вядома, якія ў бабра зубы, калі ён векавыя дрэвы валіць. Звер імгненна перакусіў артэрыю сцягна, і чалавек памёр ад артэрыяльнага крывацёку да прыезду медыкаў.

Спецыялісты тады растлумачылі агрэсіўнасць традыцыйна міралюбівай жывёлы магчымым шаленствам альбо тым фактам, што бабёр успрыняў цікаўсць чалавека за пагрозу. Ва ўсякім разе, да таго няшчасця фактаў нападзення на чалавека баброў не было зафіксавана ні ў нас, ні ў суседніх краінах. Пра трагедыю тады паведамілі не толькі нашы, але і многія замежныя сродкі інфармацыі.

Як высветлілася на горкім вопыце, нельга выключаць небяспеку нават з боку бабра. Што ўжо казаць пра ваўка ці мядзведзя?

## ХАДЗІЦЬ ГУЧНА, АБЫХОДЗІЦЬ МАЛЫХ

— Любы звер пры сустрэчы з чалавекам, першае, што зробіць, — захоча сысці, пазбегнуць сустрэчы, — гаворыць **начальнік лясной паляўнічай гаспадаркі «Выганаўскае» Нацыянальнага парка «Белавежская пушча» Мікалай БРЫЧКАЛЕВІЧ.** — Галоўнае — не правакаваць яго. Запомніце, здаровы звер ніколі не нападзе першы, калі толькі крытычную блізкасць альбо паводзіны чалавека не прыме за пагрозу. Нават гадзюка будзе нападаць, калі нага чалавека зусім блізка або на яе наступілі.

З агульных парад — не выбірацца ў лес у адзіночку. Абавязкова прыхапіце сродкі сувязі, патрэбны адпаведны вопратка і абутак, што засцерагуць ад укусаў кляшчоў, вос, шэршняў, гадзюк. А яшчэ патрэбна вопратка, якая шалясціць, яна адпуджвае многіх непажаданых насякомых і жывёл. Ісці трэба гучна: з музыкай, песнямі, размовамі, тупаць нагамі, біць палкай па дрэвах і пнях — гэта адпужае жывёл. Нават калі наступіш на сухую галіну, яна трэсне — звер не пойдзе ў ваш бок. Пры сустрэчы са зверам галоўнае — даць магчымасць яму сысці. Ніколі не падыходзьце блізка, не чапайце звярыных дзіцянят, не правакуйце звяроў — і ўсё будзе добра.

— Наконт дзіцянят трэба сказаць асобна, — падкрэслівае Мікалай Аляксеевіч. — Нашы людзі часта робяць недаравальную памылку, калі, асабліва вясной, заўважаюць у лесе казуляня, аленяня, іншае звярынае дзіцяня і, палічыўшы, што маці яго кінула, стараюцца забраць дадому. У лесе ніхто нікога не кідае. Калі малое ляжыць, то яго маці, як правіла, затаілася метраў за 50 ці больш і назірае. Варта малога ўзяць на рукі, самка можа праявіць агрэсію. Наогул не трэба браць нават зайчаня, пра яго ёсць каму паклапаціцца. Былі выпадкі, калі чалавек браў у рукі птушаня лебедзя, а самец ударам крыла перабіваў руку альбо наносіў яшчэ большыя траўмы.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## НЕ ПАНІКАВАЦЬ

Ніколі не варта прыбліжацца да параненага звера альбо такога, які паводзіць сябе неадэкватна, то-бок сам ідзе да чалавека. Апошняе сведчыць, што звер хворы. Пра такія выпадкі трэба паведамляць у органы лясной гаспадаркі альбо мясцовай улады.

Калі ж сустрэча чалавека са зверам здарылася, то самае галоўнае — не панікаваць, раіць спецыяліст, — нават калі гэта мядзведзь. Касалапых, як вядома, цяпер шмат развялося на Віцебшчыне, ёсць яны ў лясах Белавежскай пушчы. Некалькі гадоў таму буры мядзведзь быў заўважаны на тэрыторыі Кобрынскага лясгаса. Спецыялісты апошняга нагадалі, што мядзведзь ад прыроды разумны, нездарма яго дрэсіруюць у цырку. Ён таксама ў цэлым міралюбівы звер, але агрэсія можа праявіцца, калі ён нешта ў паводзінах чалавека прыме за пагрозу. І тады лясны гігант становіцца смяротна небяспечным.

Калі сутыкнуліся з мядзведзем, важна паводзіць сябе спакойна, можна пачаць гаварыць, часам гэта дапамагае. Касалапы цікаўны, ён можа захацець вывучыць невядомую істоту, калі нічога падазронага для сябе не заўважыць, потым сыдзе. Уцякаць жа ад мядзведзя — дрэнная ідэя, ён бегае хутчэй. Адыходзіць ад яго трэба памалу, без рэзкіх рухаў, не паварочвацца да яго спінай. Некаторыя паляўнічыя раяць не рэзка, па магчымасці павольна, кінуць на зямлю, напрыклад, заплечнік, асабліва калі там ёсць пах ежы, альбо нават куртку: мядзведзь пачне нюхаць і вывучаць прадмет. Гэта на некаторы час адцягне яго ўвагу. Калі ж у яго ўздыбленая поўсць на спіне, ёсць дрыжыкі ў целе, то гэта прыкмета хуткага нападзення, лепш ратавацца на дрэве, у крайнім выпадку прыкінуцца мёртвым, легчы на жывот і замерці.

## АД ДЗІКА — НА ДРЭВА

Мой знаёмы, паляўнічы са стажам з Камянецкага раёна Віктар Асіпук, кажа, што самы страшны звер у лесе — дзік. Асабліва самка. Калі ідзе з парасятамі, тады яна ўсё ўспрымае як пагрозу для дзіцянят. Важна не браць іх у рукі, не фатаграфавацца з імі, нават калі, на першы погляд, свінні няма побач. Яна можа паявіцца знянацку, і тады цікаўнаму не мінуць бяды.

Спецыялісты раяць пры сустрэчы з дзіком не ўпадаць у паніку, не рабіць рэзкіх рухаў, а пастарацца абысці жывёлу бокам. Калі вяпрук блізка, дапамагае моцны гук — дарэчы будуць гудок мабільнага, спевы, гучная размова. Калі звер бяжыць у ваш бок, лепш за ўсё ратавацца на дрэве. Ён туды не залезе, дастаткова вышыні ў метр-паўтара, і вы недасягальныя для свінні. Праўда, жывёла можа чакаць некалькі гадзін, тады давядзецца чакаць і вам, пакуль дзік не сыдзе.

## З ВАЎКОМ — ДАМОВІЦЦА

Воўк сярод буйных лясных драпежнікаў — самы бясстрашны. Здаровы воўк ніколі не нападзе на чалавека, кажа паляўнічы. Але ж правілы трэба ведаць. Сустрэўшыся з шэрым альбо нават са зграяй, трэба павольна адступаць. Ні ў якім разе нельга глядзець ваўку ў вочы, ён, як і мядзведзь, прыме гэта за сігнал для паядынку. Калі вы бачыце, што воўк гатовы напасці, старайцеся стаць спінай да дрэва, зарасніку, бярыце ў рукі палку, камень. Атрымаецца адбіцца ад аднаго ваўка, адступяць астатнія.



Паляўнічы Віктар Асіпук нядаўна сустрэўся з ваўком каля сваёй вёскі, калі ранкам гуляў з сабакам. Расказаў, што спакойна, але гучна крыкнуў у бок ваўка: «Ты чаго прыйшоў сюды, прэч адсюль!» І шэры паслухаўся, павярнуўся і патрусіў прэч.

Дарэчы, бацька аўтара гэтых радкоў расказваў, як у маладосці, недзе ў час піліпаўскай цемры, ён сутыкнуўся з ваўком, калі вяртаўся з суседняй вёскі. У кішэні быў пачак запалак. Узяў у рукі некалькі адразу, запаліў адным махам і кінуў у бок ваўка. Той баіцца агню, таму адразу развярнуўся і пабег прэч.

## ЧАМУ ПАВУЧЫЦЦА Ў КАТА?

У Мікалая Брычкалевіча я пацікавілася, ці праўда, што зверу нельга ні ў якім разе глядзець у вочы, бо ён прымае гэта за выклік? Мікалай Аляксеевіч сказаў, што сустракаўся з такімі папярэджаннямі ў сеціве, але не можа сказаць, наколькі яны адпавядаюць рэчаіснасці. Напрыклад, зайцу, які ляжыць, — пакуль не глянеш у вочы, ён не пабяжыць. «З вялікімі жывёламі я не эксперыментаваў. Калі раяць людзі, можа, варта прыслухацца. А вось іншая інтэрнэтная парада, што пры сустрэчы са зверам трэба імітаваць павелічэнне памераў, слушная. Бачылі, як часам кот пужае сабаку? Ён выцягвае спіну, узнімае поўсць і шыпіць. Так і чалавеку варта расшпіліць вопратку, павольна паднімаць рукі, візуальна павялічваючы свае памеры, — гэта можа адпужаць».

І яшчэ адна заўвага ад паляўнічага Віктара Асіпука: «У нашых лясах застаецца вельмі мала зайцоў і вавёрак, бо іх з'ядаюць большыя драпежнікі. Ніколі не страляю ў зайца, хоць гэта і дазволена правіламі палявання. Раней было так, што вушастых на кожным кроку сустрэнеш, а цяпер яны — ледзь не экзотыка. Я і сяброў-паляўнічых заклікаю не страляць зайцоў і наогул да любога звера ставіцца з павагай, бо ў лесе ён — гаспадар, а чалавек — госць».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Будзь у курсе!

# ПАЧЫНАЕЦЦА СЕЗОН ПАЛЯВАННЯ «ПА ПЯРЫ»

**З 12 жніўня адкрываецца летне-асенні сезон палявання на вадаплаўную (акрамя гусей) і балотную дзічыну, слонку, вяхіра, голуба шызага, перапёлкі і фазана.**

**Як інфармуе Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і раслiннага свету, паляванне дазволена ў светлы час сутак ружэйным (з засады, з падыходу, з пад'езда з выкарыстаннем маламерных суднаў без рухавікоў, або з выключанымі рухавікамі) і безружэйным (з выкарыстаннем лоўчых птушак) спосабамі. Падчас ружэйнага палявання дазваляецца выкарыстанне гладкаствольнай паляўнічай зброі і патронаў са шротам, выкарыстанне паляўнічых сабак, акрамя ганчакоў і хартоў.**

**З 2 верасня пералік дазволеных да здабычы паляўнічых відаў птушак дапоўніцца рабчыкам і шэрай курапаткай, а з 16 верасня — гусём белалобым, гусём-гуменнікам, гусём шэрым і канадскай казаркай.**

Прадоўжыцца летне-асенні сезон палявання на птушыную дзічыну да 10 снежня.

Летне-асенні сезон палявання адрозніваецца найбольшай папулярнасцю і масавым наведваннем водна-балотных паляўнічых угоддзяў паляўнічымі ў дні яго адкрыцця. У сувязі з гэтым не лішнім будзе звярнуць увагу апошніх на асобныя патрабаванні Правілаў палявання.

Загадзя перад выездам на паляванне трэба ўважліва праверыць наяўнасць адпаведных дакументаў і тэрміны іх дзеяння. У Дзяржінспекцыі нагадалі, што пры правядзенні ружэйнага палявання на ненарміруемыя віды паляўнічых жывёл паляўнічы павінен мець пры сабе дзяржаўнае пасведчанне на права палявання, дазвол органаў унутраных спраў на захоўванне і нашэнне паляўнічай зброі, квітанцыю або карт-чэк (у папяровым або электронным выглядзе), якія пацвярджаюць факт дзяржаўнай пошліны за прадастаўленне права на паляванне, паляўнічую пуцёўку. Дзяржаўная пошліна за прадастаўленне права на паляванне выплачваецца да пачатку палявання і пацвярджае права на паляванне на працягу дванаццаці месяцаў з дня яго выплаты.

Не лішнім будзе праверыць патранташ, падсумкі і кішэні адзення на наяўнасць забароненых да нашэння і выкарыстання пры правядзенні палявання «па пяры» паляўнічых патронаў (з карцеччу ці кулямі, патронаў да нарaзной паляўнічай зброі). Перад паляваннем на вадаплаўную дзічыну такія патроны неабходна пакінуць дома.

Паляўнічаму дазваляецца загадзя прыбыць у месца меркаванага палявання, да наступлення дазволенага для палявання часу. Пры гэтым паляўнічая зброя да наступлення дазволенага для палявання часу ў абавязковым парадку павінна быць зачахлёнай і разраджанай.

Паляўнічы павінен дакладна ведаць, у якіх паляўніча-гаспадарчых зонах, егерскіх абходах або паляўнічых дачах яму дазваляецца праводзіць паляванне, у тым ліку ведаць іх межы і рэжым (умовы палявання). Інфармацыя аб дазволеных для палявання месцах указана ў паляўнічай пуцёўцы.

У зонах спакою паляўнічых гаспадарак (індэкс зоны — У) паляванне забараняецца. У зонах вядзення паляўнічай гаспадаркі пераважна на дробную дзічыну (Б) і зонах нагонкі паляўнічых сабак (Г) паляванне, як правіла, вядзецца без абмежаванняў.

У паляўніча-гаспадарчых зонах вядзення паляўнічага промыслу пераважна на капытных паляўнічых жывёл (зона А) паляванне «па пяры» альбо забаронена, альбо праводзіцца ў прысутнасці работніка паляўнічай гаспадаркі.

Пры набыцці паляўнічай пуцёўкі абавязкова ўдакладніце межы паляўнічых гаспадарак і рэжым палявання ў іх. У выпадку правядзення палявання паляўнічага ўладкавання (раз у дзесяць гадоў) названыя вышэй межы і рэжым палявання могуць істотна змяніцца. Уважліва азнаёмцеся з загадам паляўнічай гаспадаркі аб адкрыцці сезона палявання, у тым ліку з дазволенымі для палявання тэрмінамі і паляўнічымі днямі.

У выпадку, калі ў месцы меркаванага палявання (адміністрацыйны раён) устаноўлена забарона на наведванне лясоў, праводзіць паляванне можна, але толькі ў палявых і водна-балотных угоддзях, без заходу на ўчасткі ляснога фонду (лясныя кварталы).

У працэсе палявання дапускаецца выкарыстанне толькі зарэгістраваных у Беларускім таварыстве паляўнічых і рыбаловаў паляўнічых сабак. Пацвярджэннем факта рэгістрацыі служыць рэгістрацыйная картка паляўнічага сабакі.

У Дзяржінспекцыі таксама нагадалі, што ў працэсе палявання «па пяры» дапускаецца здабыча толькі паляўнічых відаў птушак (згодна з дадаткам 1 да Правілаў палявання), указаных у паляўнічай пуцёўцы.

Акрамя таго, пры любым законным знаходжанні ў паляўнічых угоддзях у мэтах палявання паляўнічым дазваляецца таксама здабыча ваўка, шакала, лісіцы, янотападобнага сабакі, вароны шэрай, сарокі. Пры гэтым — прымяняць толькі спосабы і прылады, дазволеныя для палявання на паляўнічых жывёл, указаных у паляўнічай пуцёўцы.

Здабыча ў працэсе палявання дзікай жывёлы, якая не аднесена да паляўнічай або не ўказана ў паляўнічай пуцёўцы (за выключэннем непажаданых відаў), з'яўляецца незаконным паляваннем і цягне адміністрацыйную або крымінальную адказнасць, а таксама абавязак кампенсацыі парушальнікам прыродаахоўнага заканадаўства шкоды, прычыненай навакольнаму асяроддзю.

У пазбяганне няшчасных выпадкаў на паляванні неабходна няўхільна выконваць патрабаванні правілаў бяспекі, выкладзеных у главе 6 Правілаў палявання. Іх парушэнне цягне адміністрацыйную адказнасць у выглядзе штрафу ў памеры да 15 базавых велічынь, а ў выпадку паўторнага парушэння на працягу года — ад 10 да 30 базавых велічынь або пазбаўлення права палявання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# У БРЭСЦКІХ БАСЕЙНАХ КІПІЦЬ БАРАЦЬБА

## Якія задачы ў плаванні

**II Гульні краін СНД ужо перасягнулі экватар. А ў басейне Брэсцкага абласнога Цэнтра алімпійскага рэзерву па водных відах спорту толькі закіпелі спаборніцтвы па плаванні. Гэты від спорту — адзін з самых медалеёмістых відаў у праграме. Толькі ў першы дзень спаборніцтваў беларускія спартсмены заваявалі дзевяць медалёў. Ці тое яшчэ будзе! Тым больш колькасць спартсменаў у беларускай камандзе дазваляе не адмаўляць сабе ў медалях. У складзе нашай каманды 24 юніёры (хлопчыкі 2007—2008 гадоў нараджэння, дзяўчынкі — 2008—2009 гадоў нараджэння) плюс дадатковы састаў з 26 чалавек.**



«Мы вельмі ўдзячныя нашай краіне за тое, што атрымалася арганізаваць такі спартыўны форум. У кожнага ў камандзе ёсць адчуванне спартыўнага свята, якое мы не адчувалі ўжо даўно, спачатку з-за пандэміі, потым з-за міжнароднага бана. А ў гэтыя дні ў спартсменаў гараць вочы і яны рвуцца ў бой», — расказвае **Ганна КАПАЧЭНЯ, намеснік старшыні Беларускай федэрацыі плавання. Па яе словах, асноўнымі канкурэнтамі на II Гульнях краін СНД** будуць плыўцы з Беларусі і Расіі. Прынамсі, расійскія спартсмены — заўжды галоўныя сапернікі нашых плыўцоў. На іх карысць вялікая лаўка запасных, таму гэтая каманда бярэ колькасцю. Моцную каманду прывёз Казахстан, нядрэнна сябе праяўляюць спартсмены з Арменіі і Азербайджана.



У плаванні 16-17 гадоў — самы пачатак прафесійнага станаўлення спартсмена. Як жартуе Ганна Капачэня, у гэтым узросце плыўцы як «птушачкі, якія вучацца лятаць». Спартсмены такога ўзросту ўжо пачынаюць выступаць на міжнародных стартах. Асноўным міжнародным турнірам для гэтай узроставай катэгорыі заўсёды быў Еўрапейскі юнацкі алімпійскі фестываль. Але, на жаль, ужо некалькі гадоў беларусы на тым старце не выступаюць, спачатку яго пераносілі з-за пандэміі, а потым беларускія спартсмены трапілі ў міжнародны бан. «Калі мы даведаліся, што будуць праходзіць Гульні краін СНД, якія лічацца юніёрскім стартам, мы адразу падумалі, што на ім павінны выступіць менавіта юныя спартсмены, у якіх вельмі мала міжнароднай спаборніцкай практыкі. Яны амаль не выступалі на міжнародных стартах. І наша задача — даць ім магчымасць паглядзець, што гэта такое, і праявіць сябе на міжнародным узроўні. У спорце галоўнае — спаборніцтвы. Усё круціцца вакол іх, чым больш спаборніцтваў — тым лепш. Важна не забываць, што плаванне дастаткова манатонны від спорту, трэба шмат і доўга плаваць ад борціка да борціка, шмат часу праводзіць сам-насам са сваімі думкамі. А спаборніцтвы — гэта барацьба, эмоцыі, неабходныя плыўцам. І, вядома, калі спаборнічаеш з рознымі сапернікамі, з розных краін, павышаеш узровень свайго спартыўнага майстэрства. Гэта і цікава самім спартсменам, і эфектыўна для іх развіцця», — разважае Ганна Капачэня.

Па яе словах, II Гульні краін СНД — выдатная магчымасць для юных спартсменаў паказаць свае найлепшыя вынікі ў барацьбе з моцнымі сапернікамі. Наогул на міжнародным старце паказаць найлепшыя вынікі прасцей, чым на ўнутраным чэмпіянаце. Менавіта гэта і з'яўляецца галоўнай мэтай беларускіх плыўцоў на II Гульнях краін СНД. «У дадзеным узросце спартсмены маюць магчымасці на кожным старце паляпшаць свае вынікі, арганізм расце і яго патэнцыялу для гэтага хапае. Таму калі спартсмен паляпшае свой вынік нават на долю секунды, а ў ідэале — на некалькі секундаў, гэта паказчык эфектыўнага падыходу да трэніровак», — тлумачыць Ганна Капачэня.

II Гульні краін СНД для юных плыўцоў — галоўны старт сезона. Яны прайшлі складаны адбор, шмат рыхтаваліся і настройваліся псіхалагічна, каб палепшыць свае вынікі на першым у кар'еры міжнародным старце. Каманда — сапраўдная зборная Беларусі, у яе ўвайшлі спартсмены з кожнага рэгіёна. «Мне не хацелася б выдзяляць відавочных лідараў. Для мяне мае спартсмены ўсе малайцы, яны выканалі нарматывы адбораў для ўдзелу ў гэтых спаборніцтвах. За кожнага хварэю душой і сэрцам, кожны для мяне важны, і яны для мяне ўсё роўныя. Я хачу, каб у іх усё атрымалася», — дзеліцца намеснік старшыні Беларускай федэрацыі плавання.

### Вялікае складаецца з малога

Невядома, калі ў юных плыўцоў здарыцца наступны міжнародны старт. Міжнародная федэрацыя плавання кажа пра вяртанне беларусаў у міжнародныя басейны вельмі слаба і рэдка. Абяцалі, што на аснове рэкамендацый, якія Міжнародны алімпійскі камітэт даў спартыўным федэрацыям наконт вяртання беларусаў і расіян, спецыяльная камісія распрацуе крытэрыі для допуску беларусаў і расіян на міжнародныя старты. Абяцалі агучыць такія крытэрыі падчас чэмпіянату свету ў Японіі. Але чэмпіянат свету прайшоў у ліпені, а ніякіх крытэрыяў так ніхто і не агучыў. І гэта вялікая праблема не столькі для юніёраў, колькі для дарослых спартсменаў, членаў нацыянальнай каманды. «У нацыянальнай камандзе спартсмены хоць не маладзеюць, але яны малайцы. Вядома, кожнаму ў душу не залезеш, але мы судзім па выніках. Нашы лідары аптымізму не губляюць. Спорт — справа іх жыцця, і яны разумеюць, што здольныя на многае. Гледзячы па іх выніках, мы бачым, што свой высокі ўзровень яны захоўваюць. Ілья Шымановіч, калі б выступаў на чэмпіянаце свету, быў бы ў прызёрах. І Аліна Змушко, і Анастасія Шкурдай дэманструюць такі вынік, які дазволіў бы ім адабрацца на Алімпійскія гульні, што не можа не радаваць», — адзначае Ганна Капачэня. Свой высокі вынік беларускія спартсмены прадэманстравалі на нядаўнім Кубку Расіі, адкуль прывезлі дзесяць медалёў. «Спартсмены вельмі добра выступілі. Можа, не ўсе справіліся з задачай выхаду на свае пікавыя вынікі. Але, тым не менш, усё роўна медалі ва ўмовах сур'ёзнай канкурэнцыі — вельмі добры паказчык. Узровень канкурэнцыі на чэмпіянатах і кубках Расіі можна параўнаць з чэмпіянатам Еўропы. Спартсмены выступілі добра, але цалкам задаволенымі быць складана, таму што ўсё ў нявызначанні з нагоды далейшай сітуацыі, і гэта прыгнятае», — падкрэслівае намеснік старшыні Беларускай федэрацыі плавання. У складанай спартыўнай сітуацыі «на дно адчаю» плыўцы не пайшлі. Распрацавалі насычаны каляндар беларускіх унутраных стартаў. «Як бы мы ні спрабавалі, унутры сваёй краіны мы не зможам змадэляваць міжнародную спаборніцкую сітуацыю. Таму нам на выручку прыйшла Расія. За кошт колькасці людзей, якія ў іх займаюцца спортам, у іх высокая канкурэнцыя, і для нас гэта важна ў плане атрымання досведу. Таму расійскія спаборніцтвы дапамагаюць нам спраўляцца з незаслужаным банам», — падкрэслівае Ганна Капачэня.

У няпростыя часы ствараецца добры задзел на будучыню. Пашыраецца матэрыяльна-тэхнічная база, ствараюцца новыя аб'екты. Пра Брэсцкі абласны Цэнтр алімпійскага рэзерву па водных відах спорту ўжо ходзяць легенды. Гэты аб'ект не здзівіць міжнароднымі стартамі, прафесійнымі спартсменамі і нават сусветнымі рэкордамі. Нядаўна новы 50-метровы басейн з'явіўся і ў Магілёве. Дарэчы, менавіта ён мог бы прымаць спаборніцтвы па плаванні падчас II Гульняў краін СНД. Але загваздка ў тым, што там няма вялікай размінaчнай ванны, што вельмі важна для спаборніцтваў такога ўзроўню. Але, па словах, Ганны Капачэні, магілёўскія спецыялісты набіраюцца вопыту, хочуць і чакаюць магчымасці праводзіць буйныя старты на сваёй базе. Нядрэнна развіваецца плаванне і ў іншых рэгіёнах. «Не ўсё зводзіцца да матэрыяльна-тэхнічнай базы. Зразумела, у ідэале было б вельмі добра, каб у кожным рэгіёне быў 50-метровы басейн. Было б выдатна, калі б у кожнай вобласці быў добры цэнтр, які збіраў бы дзяцей, акумуляваў плавальную сілу вобласці і потым выводзіў бы іх на ўзровень нацыянальнай зборнай. Гэта ў ідэале. Але вялікае складаецца з малога. Нават звычайны 25-метровы басейн дае магчымасць рыхтаваць майстроў спорту. Калі ёсць жаданне, хоць бы просты басейн, то ўсё магчыма. Я думаю, кожнай вобласці пад сілу стварыць умовы для трэніровак: нармальны басейн, трэніровачная зала, цёплыя раздзявальні — сёння гэта зусім не складана. Не трэба «выдумляць веласіпед». Калі ёсць кіраўнік, які прыслухоўваецца да трэнера і разумее, што яму неабходна, дае магчымасць працаваць, і сам трэнер матываваны, то ўсё атрымаецца», — упэўнена Ганна Капачэня.

Плаванне не абдзеленае і масавасцю. Сёння плаваюць усе, усе бацькі хочуць, каб іх дзеці ўмелі плаваць — гэта карысна для здароўя, а ў краіне, дзе шмат вадаёмаў, тут яшчэ і пытанне бяспекі. Але плаваць «для сябе» — гэта адно, а прафесійна займацца спортам — зусім іншае. І тут, па словах Ганны Капачэні, на першы план выходзіць трэнерскі фактар. Калі ёсць трэнер, які зацікавіць шматгадзінным плаваннем ад борціка да борціка, дапаможа пераадолець фізічныя нагрузкі, тады ўсё будзе добра. Па словах Ганны Капачэні, з гэтым таксама асаблівых праблем няма: «У нас ёсць такія трэнеры, якія працуюць, матывуюць дзяцей. Ёсць хлопчыкі і дзяўчынкі, у якіх вочы гараць. А калі вочы гараць у трэнера, які хоча дасягаць высокіх вынікаў, то ён абавязкова вырасціць зорачку, што будзе ззяць на спартыўным небасхіле. У нас ёсць спартсмены і трэнеры, здольныя на многае. Можа быць, іх не так шмат, але для нашай краіны дастаткова. Таму мы заўсёды аптымістычна настроеныя. Плаванне сёння перажывае вельмі няпростыя часы. Але мы не сядзім склаўшы рукі, спадзяёмся на лепшае і стараемся паказваць выдатныя вынікі».

**Валерыя СЦЯЦКО,**
*г. Брэст.*

## II ГУЛЬНІ КРАІН СНД ДЭМАНСТРУЮЦЬ УСІМ ВЯДОМЫ ПРЫНЦЫП «СПОРТ ПА-ЗА ПАЛІТЫКАЙ»

**II Гульні краін СНД — гэта не толькі спартыўная, але і грамадска-палітычная падзея. Сваім меркаваннем наконт неспартыўнага значэння спартыўнага форуму падзяліліся члены Савета Рэспублікі.**

Па словах **Дзмітрыя ДЗЯМІДАВА, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, II Гульні краін СНД** — яркі прыклад таго, як спорт можа гуртаваць народы, умацоўваць міжнародныя адносіны і садзейнічаць міжкультурнаму дыялогу. Ён падкрэсліў, што Гульні, якія праходзяць у Беларусі, даюць удзельнікам і гасцям маштабнага форуму магчымасць адчуць гасціннасць і ветлівасць нашага народа, паказваюць нашу адкрытасць і добрасуседства. «Прыемна, што ў ліку тых, хто змагаецца за месцы на п'едэстале, — 12 наваполацкіх атлетаў. Падставы для гонару нам ужо падарылі Генадзь Лапцеў, які заваяваў «золата» ў спаборніцтвах па цяжкай атлетыцы, а таксама дзюдаісткі Кацярына Вішняк і Віялета Фёдарава, якія сталі бронзавымі медалісткамі ў складзе змешанай каманды Беларусі. Выдатна выступілі Вераніка Шчарбянок, якая апынулася на другой ступені п'едэстала гонару ў кіданні молата, і Рыгор Вярцінскі, ён паказаў трэці вынік у цяжкай атлетыцы», — сказаў сенатар.

**Аляксей НЯВЕРАЎ, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве,** падкрэсліў, што II Гульні краін СНД дэманструюць усім вядомы прынцып «спорт па-за палітыкай». «Гульні праходзяць у Мінску, Гомелі, Жлобіне, іншых гарадах нашай краіны на высокім арганізацыйным узроўні, што адзначаюць многія калегі з замежных краін, у тым ліку спартыўныя функцыянеры. Гаворка не толькі аб традыцыйнай гасціннасці беларусаў, але і аб выдатнай базе, сучасных аб'ектах, якія адпавядаюць усім сусветным стандартам», — сказаў ён. Сенатар заўважыў, што сам форум набірае абароты. Калі І Гульні ў Татарстане два гады таму сабралі паўтары тысячы ўдзельнікаў з дзевяці краін, то ў Беларусь з'ехалася ўжо больш за дзве тысячы спартсменаў з 22 краін. «Для Саюзнай дзяржавы, усіх дружалюбных нам краін вопыт правядзення такіх маштабных спаборніцтваў вельмі важны. Такое спартыўнае свята, безумоўна, чарговы раз дасць зразумець Міжнароднаму алімпійскаму камітэту, што манаполіі на спорт у свеце не існуе, а палітызацыя спорту заўсёды будзе ўспрымацца сусветнай супольнасцю ў негатыўным ключы», — рэзюмаваў Аляксей Няверaў.

**Ала СМАЛЯК, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці назвала II Гульні краін СНД** сапраўдным святам сяброўства і адзінства: «Наша Беларусь даўно пацвердзіла статус спартыўнай, адкрытай, гасціннай краіны, якая ўмее арганізаваць усё на самым высокім узроўні. II Гульні краін СНД пераконваюць у гэтым чарговы раз. Водгукі дэлегацый гучаць самыя станоўчыя. Прыемна, што гарачыя баталіі разгортваюцца на спартыўных пляцоўках ва ўсіх рэгіёнах. Гэта дае магчымасць яшчэ большай колькасці людзей стаць сведкамі відовішчнай, напоўненай яркімі момантамі падзеі. І мы бачым, які накал эмоцый пануе не толькі на спаборніцкіх арэнах, але і на трыбунах, каля фан-зон. Нашы балельшчыкі цёпла падтрымліваюць усіх спартсменаў, падзяляючы з імі і радасць перамог, і горыч паражэнняў».

# У ПЕРШЫХ МАТЧАХ КАРЫСНА ПАНЕРВАВАЦЦА

## Беларускія валейбалісты прынеслі новыя перамогі

**Спаборніцтвы II Гульняў краін СНД карыстаюцца папулярнасцю сярод гледачоў. Не сталі выключэннем і спаборніцтвы па валейболе, якія праходзяць у Палацы спорту (тут гуляюць юніёры), а таксама на «Чыжоўка-Арэне», дзе выступаюць дзяўчаты. Людзі з энтузіязмам ідуць на трыбуны, каб падтрымаць сваіх спартсменаў. І гуляць пры такой падтрымцы — вялікае задавальненне.**



Беларуская жаночая каманда на пляцоўцы «Чыжоўка-Арэны» лічыцца адным з фаварытаў турніру. І дзяўчаты такое званне пацвярджаюць: з вынікам 3:0 расправіліся з камандай Арменіі. Затым з такім жа вынікам абыгралі Казахстан. Сёння дзяўчаты згуляюць супраць Таджыкістана ў 16.00, а ў нядзелю ў 11.00 паспрачаюцца з расіянкамі. «Мяне перапаўняюць эмоцыі, гэта была вельмі добрая гульня, мы ўсёй камандай працавалі на вынік, — расказала **гулец беларускай зборнай па валейболе Марына БРАТКОЎСКАЯ.** — Сапернікі розныя, але мы ўсё роўна стараемся, гуляем і хочам заняць першае месца. Мы настроіліся на перамогу, нам дапамагае наш трэнер, падтрымлівае нас, без яго — нікуды. Усе нашы перамогі — гэта яго заслуга. Мы яго вельмі любім!»

Спартсменка адзначыла, што падтрымка публікі важная для перамогі і баявога настрою: «Адчуваецца, што за нас хварэюць, людзі гучна падтрымліваюць. Гэта матывуе нас на перамогу і мы хочам гуляць яшчэ. Хутка будзем гуляць з Таджыкістанам, а ў апошні дзень — Расіяй. Спадзяюся, мы ўсіх выйграем і зоймем першае месца, будзем ісці толькі наперад».

«Я б не сказаў, што гульня з Казахстанам была простая. Сапернік прымусіў нашых дзяўчат трошкі панервавацца. Можа, тое і добра ў першых гульнях, але галоўнае, каб гэты пераможны дух падоўжыўся да канца турніру, — звярнуў увагу **галоўны трэнер юніёрскай зборнай U-16 Генадзь АЛЕКСАНДРОВІЧ.** — Відавочна, мы хочам згуляць з Расіяй. Там усё ж такі валейбол на вельмі высокім узроўні, але мы з імі змагаемся. Выдатна, што з расійскай камандай мы будзем гуляць у самым канцы. Не павінен знікнуць перадстартавы мандраж, усё ж такі гуляюць дзеці, а гэта афіцыйныя спаборніцтвы на ўзроўні зборнай. Таму, вядома, хваляванне было і ёсць, і спадзяюся, да канца турніру яно знікне».

Галоўны трэнер таксама падкрэсліў, што падтрымка балельшчыкаў вельмі прыемная для дзяўчат. Яна сапраўды дапамагае: «Я, дарослы чалавек, вельмі рады, што столькі людзей прыйшло нас падтрымаць, а дзяўчаты — нашмат больш. Яны такога не чакалі, ім вельмі прыемна, дзякуй усім вялікі!»

Шумна і горача ў гэтыя дні і на пляцоўцы сталічнага Палаца спорту, дзе праходзяць спаборніцтвы па валейболе сярод мужчынскіх камандаў. У чацвер беларускія спартсмены прымалі валейбалістаў з Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, якія стартавалі на турніры з двух паражэнняў. Супраціўленне ад гасцей з ААЭ нашы спартсмены не адчулі, у выніку — чарговая перамога з лікам 3:0 (25:8, 25:8, 25:14). Нагадаем, што наша зборная ў сваім першым матчы на Гульнях перамагла армян (3:0). «Задачу выканалі на ўсе 110 працэнтаў, — эмацыянальна распавёў журналістам **галоўны трэнер зборнай Беларусі Андрэй МІХНЕВІЧ.** — Хлопцамі ўсімі задаволены. Усе адпрацавалі добра, якасна. А самае галоўнае, што абыйшліся практычна без памылак».

Завершаць выступленні на турніры нашы хлопцы гульнёй супраць расіян, якая пройдзе ў нядзелю і пачнецца ў 12.30.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# ЖНІВЕНЬ — ПЯЦІБОРСКІ МЕСЯЦ

## Рыцары пяці якасцяў паказалі свае здольнасці

**Гледзячы на гэтых спартсменаў, думаеш толькі адно — «адкуль у іх сілы?». Спаборніцтвы па сучасным пяціборстве — гэта вельмі яркая дэманстрацыя сілы духу і фізічных магчымасцяў чалавека. За адзін спаборніцкі дзень спартсмен трэба выступіць у фехтаванні, плаванні, верхавой яздзе і бегу са стральбой. Назіраць за тым вельмі захапляльна, а яшчэ больш захапляльна разумець, як шмат можа чалавек, нават зусім яшчэ малады. Свае здольнасці падчас II Гульняў краін СНД паказалі юныя рыцары пяці якасцяў. Лепш за непасрэдных удзельнікаў ніхто не апіша падзею. Фіналы індывідуальных спаборніцтваў па сучасным пяціборстве — у самых яркіх цытатах іх удзельнікаў.**






«Сілы бяруцца, калі ўдзельнічаеш у такім грандыёзным мерапрыемстве. Дзякуй усім, хто мае дачыненне да такога грандыёзнага свята. Дзякуй нашай федэрацыі, дзякуй кожнаму заўзятару. Я бегла і адчувала падтрымку кожнага чалавека на трыбунах, я цяпер ведаю, што такое выступаць пры падтрымцы сваіх трыбун. Я не планавала паказаць такі вынік, у мяне была сур'ёзная траўма. Дзякуй урачам, бацькам і ўсім, хто дапамагаў і падтрымліваў. Перад бегам у мяне было адставанне 55 секундаў, але я не перажывала. «Камбайн» (камбінаваны бег са стральбой. — **«Зв.»**) — мой каронны від, і я ведала, што буду змагацца да апошняга і пераадолею ўсе цяжкасці. Было вельмі складана, але я ведала, што ўсё будзе добра. Я вельмі люблю фехтаванне, і ў мяне яно склалася. Я не люблю плаваць, але і плаванне склалася, я не чакала ад сябе такога выніку», — першыя словы **пераможцы спаборніцтваў па сучасным пяціборстве Марыі ГНЕДЧЫК** пасля фінішу.

На II Гульнях краін СНД пяціборцы выступаюць у чатырох відах: фехтаванне, плаванне, лазер-ран. У жаночым фінале пасля фехтавання і плавання лідарам на старт лазер-рана выходзіла расіянка Вікторыя Сазонава. Яе адрыў ад найбліжэйшай саперніцы беларускі Міры Бурай складаў 44 секунды, ад якой на 7 секундаў адставала Марыя Гнедчык. Але беларускія спартсменкі скарацілі адставанне. Марыя заваявала «золата». Міра — «серабро». Вікторыя стала бронзавым прызёрам.

Па словах Марыі Гнедчык, перамога стала для яе нечаканай. Падчас падрыхтоўкі да старту спартсменка сутыкнулася з траўмай. Але, дзякуючы свайму характару і падтрымцы трэнераў, і асабліва мамы Аксаны Гнедчык, якая трэніруе дачку, усё атрымалася. «Мама сказала: «Дачушка, пацярпі, ты ўсё зможаш». Мама — адзіны чалавек, хто верыў у мяне. Я сама не верыла, што змагу тут перамагчы, а яна верыла. Усё дзякуючы маме, без яе не было б нічога. Гэтую перамогу я прысвячаю сваёй маме», — прызналася Марыя.

Па выніках індывідуальнага турніру сталі вядомыя і імёны пераможцаў і прызёраў каманднага заліку. Залатыя ўзнагароды заваявала першая зборная Беларусі, у склад якой увайшлі Марыя Гнедчык, Міра Бурая, а таксама Анастасія Малашэнка, якая ў асабістым турніры фінішавала чацвёртай. На другім месцы спартсменкі з Расіі, на трэцім — прадстаўніцы Егіпта.

«Усё задуманае атрымалася. Мы чакалі дзвюх дзяўчынак на п'едэстале — таму ў нас усё па плане. Мы планавалі, што ў Машы Гнедчык будзе залаты медаль. І яна разумнічка, пацвердзіла свой узровень. І ў Міры, і ў Машы былі траўмы. Але дзяўчынкі запэўнілі мяне, што на турніры ўсё будзе добра. А я прывыкла давяраць сваім спартсменам і я ведала, што ўсё будзе добра», — дзялілася **Алена НЫРЦОВА, трэнер зборных камандаў Беларусі па сучасным пяціборстве.** Цяпер яна са сваімі падапечнымі пачынае падрыхтоўку да наступных стартаў. 16 жніўня ў Мінску стартуе фінал Кубка Паўла Ляднёва, дзе выступіць Марыя Гнедчык. Міра Бурая выступіць на Кубку дружбы, які пачнецца 22 жніўня. Як жартуе Алена Нырцова, жнівень — пяціборскі месяц.

«Развязка фіналу была шыкоўная. Я не чакала, што дзяўчынкі будуць змагацца за першае месца з такім адрывам. Надзея была, але ўлічваючы, што ў іх былі траўмы і яны не рабілі спецыяльных нагрузак, надзея была слабай. Яны праявілі мужнасць, сапраўдны спартыўны баявы характар. З гарачым сэрцам і з халоднай галавой паказалі сябе ў кожным відзе праграмы. Вельмі хвалююча глядзець спаборніцтвы з трыбун. Я нават праслязілася, калі Маша фінішавала. Маша «сабрала сябе ў Машу» і зрабіла ўсё, што можа», — за жаночымі спаборніцтвамі з трыбун назірала **Настасся ПРАКАПЕНКА, пяціразовая чэмпіёнка свету, бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў.** Па яе словах, выступленне дзяўчат у фінале надало ёй упэўненасці і спакою ў будучыні жаночага пяціборства ў нашай краіне. Тым больш Марыя Гнедчык і Міра Бурая паказалі вынік «за сябе і за таго хлопца».

### Мы паказалі прыгожую і шчырую барацьбу

«Выступленнем усё ж задаволены. Трохі падвяла стральба, з самай раніцы быў зарад на плаванне і на «камбайн», а там ужо як пайшло. Вельмі цяжка выступаць пры спякоце. І з-за гэтага было цяжка сфакусіравацца на стральбе, калі вельмі горача, неверагодна складана сканцэнтравацца на мушцы. Я разумеў, якія ў мяне сапернікі, ведаў, што яны добра бягуць і добра страляюць. Мы паказалі прыгожую, а самае галоўнае — сумленную барацьбу», — падвёў вынікі свайго выступлення беларус **Аляксей САФОНЧЫК.** На вырашальны від спаборніцкай праграмы лазер-ран ён выходзіў першы, але ў выніку заняў толькі чацвёртае месца. Першыя тры месцы ў мужчынскім фінале раздзялілі паміж сабой расійскія пяціборцы. Аднак турнір беларускія хлопцы скончылі з медалямі. У камандным заліку Аляксей Сафончык, Данііл Беляковіч і Мікіта Лысенка заваявалі сярэбраныя медалі.




На гэтым спаборніцтвы па сучасным пяціборстве не заканчваюцца. На суботу запланаваныя мужчынская і жаночая эстафеты, а ў нядзелю пройдзе змешаная эстафета.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ**

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – ОАО «АСБ Беларусбанк»




Наименование объекта продажи: капитальное строение

**(назначение – здание специализированное финансового назначения)**

**общей площадью 3582,6 кв. м, расположенное в г. Минске, ул. Карбышева, 13/2.**

Начальная цена продажи составляет: 4 419 600,00 руб. (четыре миллиона четыреста девятнадцать тысяч шестьсот рублей 00 копеек) с учетом НДС.

Сумма задатка: 4 419,60 руб. (четыре тысячи четыреста девятнадцать рублей 60 копеек).

Обязательные условия аукциона: победителю торгов либо единственному участку, изъявившему готовность приобрести реализуемое капитальное строение, заключить с ОАО «АСБ Беларусбанк» договор по приобретению имущества (основные средства и ТМЦ согласно приложению 1) общей стоимостью 296 389,47 руб. (двести девяносто шесть тысяч триста восемьдесят девять рублей 47 копеек) с учетом НДС, предназначенного для эксплуатации отчуждаемого объекта недвижимости.

**Открытый аукцион состоится 15.09.2023 в 11.00 по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, актовый зал (6-й этаж).**

Заявление на участие принимается в рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45 по 13.09.2023 включительно по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, кабинет 602 (тел. (017) 2794655, (017)2794930).

Продавец – ОАО «АСБ Беларусбанк».

По вопросам, связанным с организацией осмотра объекта продажи, обращаться по телефонам: (017) 279 46 55 – Сосновский Дмитрий Викторович; (017) 279 47 74 – Баёк Павел Александрович.

*Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка по 13.09.2023 включительно на счет № BY69AKBB66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.*

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 40 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона.

Информационное сообщение о реорганизации

## ЗАО «БЕЛСИЛАНТХИМ»

Полное наименование и местонахождение реорганизуемых юридических лиц: закрытое акционерное общество «БЕЛСИЛАНТХИМ», (местонахождение: 223016, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Новодворский с/с, 79, каб. 51, район аг. Новый Двор, АБК) и закрытое акционерное общество «СПЕЦОРГСТРОЙ», (местонахождение: 223016, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Новодворский с/с, 79, район аг. Новый Двор, АБК).

Способ реорганизации: ЗАО «БЕЛСИЛАНТХИМ» реорганизуется в форме присоединения к ЗАО «СПЕЦОРГСТРОЙ».

Наименование уполномоченного органа, принявшего решение о реорганизации, и дата принятия такого решения: внеочередное общее собрание акционеров ЗАО «БЕЛСИЛАНТХИМ», протокол № б/н от 08.08.2023 г.

Порядок распределения акций среди участников акционерного общества при реорганизации: дополнительно выпущенные акции ЗАО «СПЕЦОРГСТРОЙ» распределяются между акционерами присоединяемого акционерного общества пропорционально количеству принадлежащих им акций в присоединяемом акционерном обществе.

Дата внесения в Единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей (ЕГР) записи о прекращении деятельности присоединенной организации: на момент раскрытия информации запись о прекращении деятельности присоединенной организации в ЕГР не внесена.

Полное наименование, местонахождение и учетный номер депозитария, с которым эмитентом заключен депозитарный договор: Открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, УНП 100693551.

УНП 691596006

Информационное сообщение о реорганизации

## ЗАО «СПЕЦОРГСТРОЙ»

Полное наименование и местонахождение реорганизуемых юридических лиц: закрытое акционерное общество «БЕЛСИЛАНТХИМ», (местонахождение: 223016, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Новодворский с/с, 79, каб. 51, район аг. Новый Двор, АБК) и закрытое акционерное общество «СПЕЦОРГСТРОЙ», (местонахождение: 223016, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Новодворский с/с, 79, район аг. Новый Двор, АБК).

Способ реорганизации: ЗАО «СПЕЦОРГСТРОЙ» реорганизуется в форме присоединения к нему ЗАО «БЕЛСИЛАНТХИМ».

Наименование уполномоченного органа, принявшего решение о реорганизации, и дата принятия такого решения: внеочередное общее собрание акционеров ЗАО «СПЕЦОРГСТРОЙ», протокол № б/н от 08.08.2023 г.

Порядок распределения акций среди участников акционерного общества при реорганизации: дополнительно выпущенные акции ЗАО «СПЕЦОРГСТРОЙ» распределяются между акционерами присоединяемого акционерного общества пропорционально количеству принадлежащих им акций в присоединяемом акционерном обществе.

Дата внесения в Единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей (ЕГР) записи о прекращении деятельности присоединенной организации: на момент раскрытия информации запись о прекращении деятельности присоединенной организации в ЕГР не внесена.

Полное наименование, местонахождение и учетный номер депозитария, с которым эмитентом заключен депозитарный договор: Открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, УНП 100693551.

УНП 101083937

Извещение о проведении **29 августа 2023 года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «НПО Центр»

| **Предмет торгов** |
|---|
| изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7988190087, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Шаранговича, 19/2-2 (общая площадь – 675,4 кв. м; наименование – помещение экспериментально-исследовательской станции; назначение – производственное помещение);<br>изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7988190088, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Шаранговича, 19/2-3 (общая площадь – 627,8 кв. м; наименование – помещение экспериментально-исследовательской станции; назначение – помещение неустановленного назначения);<br>изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7988190089, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Шаранговича, 19/2-4 (общая площадь – 593,5 кв. м; наименование – помещение экспериментально-исследовательской станции; назначение – помещение неустановленного назначения) |
| Начальная цена: 2 250 000,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 225 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «НПО Центр», ул. Шаранговича, 19, комн. 304, 220018, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов (условия продажи):**

победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов;

на победителя торгов (покупателя) возлагаются расходы по оформлению, государственной регистрации заключаемого по итогам аукциона договора купли-продажи, переходу права собственности на продаваемое имущество.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «НПО Центр», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «НПО Центр».*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в следующем порядке: 50 процентов от цены продажи предмета торгов оплачиваются в течение 5 рабочих дней с момента подписания договора купли-продажи; оставшаяся сумма оплачивается равными долями в течение 6 месяцев.

Торги проводятся **29 августа 2023 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 14.08.2023 по 28.08.2023 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Осмотр продаваемого имущества и ознакомление с имеющейся документацией осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Шаранговича, 19. По вопросу осмотра следует обращаться по телефонам: (017) 259-05-54, (029) 686-45-13.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 259-05-54, (029) 686-45-13 (ОАО «НПО Центр»).**

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **УП «Пинская СПМК-5»** (УНП 200111234) объявляет о проведении **13.09.2023 г.** с 9.00 до 16.00 на электронной торговой площадке bankrottorg.by электронных торгов в форме аукциона

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2023/08/spisok-imushhestvapmk.pdf**

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296569865, Виктор.

Продавец: УП «Пинская СПМК-5».

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **12.09.2023 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **14.08.2023** по 17.00 **12.09.2023** на bankrottorg.by.

К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) и направляются в отсканированном виде по адресу: contact@bankrottorg.by следующие документы:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за 5 дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ – 120,00 бел. руб., возмещение за оценку – 507,08 бел. руб., стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре, аукционный сбор 5 % от цены реализации имущества без учета НДС (НДС 20 %).

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 30 календарных дней с даты проведения электронных торгов.

Дополнительные условия: срок регистрации сделки купли-продажи в органах регистрации – 90 календарных дней.

В 2023 г. планируется разработка нового генерального плана города Пинска. Территорию в границах ул. Рокоссовского и ул. Интернациональной планируется предусмотреть под многоквартирную жилую застройку.

Ликвидатор – частное унитарное предприятие по оказанию услуг **«ЭкспертБанкрот»** в лице директора Шило Алексея Сергеевича – объявляет о проведении повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества

**ООО «Строительный поток» (строительные материалы)**

Дата торгов – 25.08.2023 в 10.00.
Место проведения торгов: г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 517, тел. 8029 336-08-72.

Подробная информация о дате, времени и порядке проведения торгов, предлагаемых к продаже лотах, начальной цене и размере задатков, продавце и организаторе, иная информация, требуемая в соответствии с законодательством, размещена на сайте частного предприятия «ЭкспертБанкрот» http://expertbankrot.by и по телефону 8029 336-08-72.

УНП 192352712

Утерянный представительством Белгосстраха по Заводскому району г. Минска бланк строгой отчетности страхового свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии МА № 5265020 **считать недействительным.**

УНП 100122726

17.08.2023 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня
1) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

Дата сбора реестра акционеров – 11.08.2023 г.

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 11.08.2023 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 200050191

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

**31 августа 2023 г. проводит 8-й повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 46 | Грузовой (цистерна) KAMAZ 53213, кузов (рама) № 007815, рег. № АН 1238-1, 1986 г., пробег 7806 км | г. Брест, ул. Краснознаменная, 10 | 15 000,00 | 3 000,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, **31 августа 2023 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 28 августа 2023 г**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **31 августа 2023 г. с 9.15 до 10.00.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»:

белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факс: 8 (017) 319-35-41, +375 (44) 585-76-82.

Электронная почта: **auk@bsk.by**.

Извещение опубликовано на сайте http://www.gki.gov.by/ru/ и https://bsk.by.

# Дылема паходжання Мінска будзе вырашана?

## Што знайшлі на раскопках каля Менкі

**Прыкладна за дзесяць кіламетраў на захад ад сучаснага Мінска, на беразе ракі Менкі пры ўпадзенні ў яе ручая Дунай, размешчана старажытнае гарадзішча. Вучоныя мяркуюць, што менавіта тут знаходзіўся летапісны Мінск. Аб гэтым кажуць і знойдзеныя там артэфакты. Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка даручыў Нацыянальнай акадэміі навук арганізаваць маштабнае вывучэнне археалагічнага комплексу. Гэта неабходна для вызначэння яго гісторыка-культурнай ролі ў IX—XI стагоддзях і яго значэння ў гісторыі Мінска і Беларусі.**



**Вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-фондавай работы Музея гісторыі горада Мінска Яўгенія СТАЛЬМАХОВА.**

Палявы археалагічны сезон 2023 года на беразе ракі Менка пачаўся ў красавіку з правядзення інструментальнага даследавання першага селішча і працягнуўся летам паўнавартаснымі археалагічнымі раскопкамі. На першым селішчы былі закладзены два раскопы агульнай плошчай 220 квадратных метраў, на другім — таксама два раскопы плошчай 104 квадратныя метры.

Больш за 100 унікальных рэчаў IX—XII стагоддзяў было прадстаўлена на выставе «Падарожжа ў мінулае: галоўныя артэфакты з археалагічнага комплексу на рацэ Менка», якая больш за два тыдні працавала ў Мінскай гарадской ратушы і закрыецца заўтра, 13 жніўня. Сярод экспанатаў — фрагменты керамічных гаршчкоў і таварныя пломбы з княжымі знакамі прадстаўнікоў полацкай дынастыі. Асобнае месца адведзена знаходкам з комплексу «ювелірная майстэрня», які знойдзены на другім селішчы: матрыцам, загатоўкам для стварэння ювелірных вырабаў, спецыяльным інструментам ювеліра.

У раскопках пад кіраўніцтвам навукоўцаў і археолагаў з Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі бяруць удзел студэнты вядучых дзяржаўных універсітэтаў з розных рэгіёнаў краіны, а таксама валанцёры.

— Гэта самыя буйныя раскопкі археалагічнага сезона, якія вядуцца сіламі беларускіх універсітэтаў пад кіраўніцтвам археолага Андрэя Вайцяховіча, — адзначыла **вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-фондавай работы Музея гісторыі горада Мінска Яўгенія СТАЛЬМАХОВА**. — Гэта каласальная колькасць людзей. Галоўная задума — максімальна раскрыць археалагічны комплекс. На працягу апошніх месяцаў яны капалі селішча неўмацаванага гарадзішча на валах. Гэта велізарная пляцоўка, абмежаваная валамі на некалькі дзясяткаў метраў плошчай некалькі гектараў.

Спецыяліст мяркуе, што гарадзішча было заселена ў IX—X стагоддзях: «Галоўнай задачай было правесці комплекснае даследаванне. Цяпер яны разразаюць вал, глядзяць, што там унутры. Вал — гэта земляны насып, які абараняў насельніцтва ад нападзення. З аднаго боку там працякае легендарная рэчка Менка, ад якой, як мяркуюць многія гісторыкі, пайшоў наш Мінск, яго назва. Дылема нашых беларускіх археолагаў — адкуль пачынаўся Мінск. Яе хацелася б вырашыць».





Паводле адной з гіпотэз, менавіта гэтае гарадзішча было старажытным Менскам, а ўжо пасля таго, як яго некалькі разоў спалілі, паселішча перанеслі на цяперашняе месца — каля рэк Свіслач і Няміга. Гэта адзін з найважнейшых археалагічных помнікаў Беларусі.

Але дакладна вызначыць, адкуль пайшоў Мінск, — справа не аднаго археалагічнага сезона. Яўгенія Стальмахова звяртае ўвагу, што на Менцы было паселішча менавіта гарадскога тыпа, а не сельскага.

— Знойдзеныя артэфакты кажуць аб развітой матэрыяльнай культуры, рамёствах. Напрыклад, адными з самых топавых знаходак з'яўляюцца донцы з княжымі клеймамі. Як мяркуе Андрэй Вайцяховіч, адно з гэтых донцаў — з таўром сына Рагнеды Ізяслава, — распавяла вядучы супрацоўнік.

Па словах спецыяліста, былі знойдзены дзіўныя фрагменты керамікі IX—X стагоддзяў з цудоўнай арнаментацыяй і нават сальніца для нейкіх спецый, а таксама дырхемы, што кажа аб развітых эканамічных сувязях з Блізкім Усходам, з арабскімі дзяржавамі.

Дзякуючы знаходкам на Менцы можна ўявіць, як упрыгожвалі сябе людзі больш за тысячу гадоў таму.

— У нас ёсць комплекс ювелірнай майстэрні, інструменты ювеліра, розныя формы для ліцця. Накладкі на рамяні, фібулы для зашпількі плашча, бранзалет, скроневыя кольцы і падвеска, загатоўка для пярсцёнка. Таксама былі знойдзены і шкляныя каралі. У нас доўгі час не было шкла. Гэта кажа пра тое, што тут былі рэчы замежныя. Прадстаўлены і касцяныя грабеньчыкі, — звярнула ўвагу Яўгенія Стальмахова.

Самае цікавае — дырхемы, манета Ягайлы ці Вітаўта, гандлёвыя пломбы. У археалагічным асяроддзі прынята лічыць, што такімі пломбамі таўравалі князі тавар, які пастаўляўся з іх тэрыторыі.

Яшчэ адна незвычайная рэч — жарон. Яго, як мяркуе спецыяліст, выкарыстоўвалі ў рытуальных мэтах. Ёсць і шыферныя (вытачаныя з каменю), і гліняныя праслiцы. Шырока прадстаўлена гаспадарчая атрыбутыка: тачыльныя камяні, фрагмент каменнай сякеры, нажыкі, кісцень, паплавок, ключ, ручка ад вядра.

— Ад нашых археолагаў мы чакаем новых адкрыццяў. Гэта знакавая пляцоўка, таму што звязаная з пытаннем узнікнення Мінска. Важна тое, што там захаваліся валы. Было б выдатна стварыць там музей. Цяпер ідзе гаворка пра тое, каб зрабіць гэтыя раскопкі асновай для экспазіцый, але пакуль не ведаем, як гэта будзе выглядаць, — падагульніла Яўгенія Стальмахова.

**Даніiл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**





## Алег ЧЫРКУН:

# «ЗДОЛЬНАСЦЬ АДЧУВАЦЬ МУЗЫКУ МНЕ ДАДЗЕНА АД БОГА»

**Талент усюды знойдзе сабе дарогу. Пацвярджэнне таму — гісторыя беларускага кампазітара, заслужанага дзеяча мастацтваў Алега Чыркуна. Ён насуперак усім жыццёвым акалічнасцям знайшоў свой шлях у прафесію. Сёння Алега Міхайлавіча ведаюць і любяць як аўтара песень і шматлікіх музычных твораў (музыка да тэатральных пастановак, сімфоніі, аперэты, кантаты, музычныя казкі). У размове з маэстра даведаліся, што вызначае шчаслівы лёс музычных твораў, хто фарміраваў яго погляды на майстэрства і дзе ён заўсёды знаходзіць натхненне.**

***— Алег Міхайлавіч, вы з дзяцінства цягнуліся да музыкі, але пайшлі вучыцца спачатку на будаўніка-муляра...***

— Я нарадзіўся падчас вайны. Калі мне было 2-3 гады, апынуўся ў дзіцячым доме ў Глуску, таму што ў мяне хварэла маці, мела інваліднасць. Мы жылі там у такой драўлянай хаце. Помню, як аднойчы ўбачыў, як да дзіцячага дома ідзе жанчына, і я кінуўся да яе з крыкам «Мама!» Відаць, проста адчуў роднага чалавека. Пасля аказалася, што гэта сапраўды мая маці. Яна знаходзіла мяне і забірала дадому штораз, калі выходзіла з бальніцы. Так апошні раз забрала мяне з дзіцячага дома ў Высокім Брэсцкай вобласці. Мне тады ўжо 15 гадоў было. І я ўжо разумеў, мне трэба ўмець рабіць тое, што змогу пракарміць. А ў будаўнічым вучылішчы давалі форму і кармілі, таму і пайшоў у муляры. Пасля заканчэння вучобы працаваў на заводзе. Пазней паступіў ужо ў Мінскае музычнае вучылішча імя М. І. Глінкі і адтуль пачаўся мой шлях у музыку.

***— Вы самі разумелі свае здольнасці ці хтосьці дапамог разгледзець талент?***

— Мне здаецца, што мая цяга да музыкі і здольнасць яе адчуваць — гэта прызванне, і яно мне дадзена ад Бога. Я пачаў іграць на музычных інструментах яшчэ ў дзіцячым доме ў Маларыце. Там у нас было шмат розных інструментаў. Я як дзіця цікавіўся імі, спрабаваў нешта іграць і так асвойваў іх самастойна. Яшчэ спяваў. Быў тады фільм індыйскі «Бадзяга», і мне падабалася песня адтуль. Вывучыў яе і выконваў, падбіраючы музыку на слых.

Я быў не з тых дзяцей, якія ходзяць у музычную школу, спасцігаючы там майстэрства. Проста іграў усюды і на тым, што аказвалася ў полі зроку. Напрыклад, у дзіцячым доме ў Высокім быў баян. Навучыўся іграць на ім і акампанаваў на танцах, якія ў нас там ладзіліся. Падчас вучобы ў школе ў Мінску са мной займаўся настаўнік спеваў і падрыхтаваў мяне да выступлення на тэлебачанні, дзе я спяваў «Арляня» і «Санта Лючыю».



А пазней мама на свае зберажэнні купіла мне мой першы гармонік-двухрадку, хоць вялікага дастатку яна і не мела. Мы жылі ў інтэрнаце, і там я таксама іграў на танцах.

***— Кампазітарскае майстэрства вы спасцігалі ў вялікіх майстроў сваёй справы. Ці ўплывала тое на ваша стаўленне да прафесіі?***

— У музычным вучылішчы ў мяне быў педагогам па кампазіцыі Рычард Пятровіч Буцвілоўскі. Ён, можна сказаць, даў мне дарогу ў прафесіянальнае жыццё. У кансерваторыі я вучыўся ў Пятра Пятровіча Падкавырава, у Дзмітрыя Браніслававіча Смольскага па класе кампазіцыі. Выкладалі ў нас таксама Анатоль Васілевіч Багатыроў, Ігар Міхайлавіч Лучанок. Проста так кампазітарам не станеш, нават калі і можаш нешта сачыняць. Калі ж гэтая здольнасць даецца чалавеку ад прыроды, то нараджаецца ўжо зусім іншая музыка. І ў наш час ёсць вельмі шмат кампазітараў, але так мала якаснага музычнага матэрыялу, бо вучыцца кампазіцыі — гэта не проста здольнасць мелодыі складаць. Там спасцігаеш тэхніку, а астатняе ўжо залежыць ад тваёй творчай індывідуальнасці. Трэба шмат пісаць, працаваць, каб стаць сапраўдным прафесіяналам. І няма сэнсу капіраваць тых, хто побач. Хоць калі я пісаў свае першыя творы, само сабой, яны ўсё ж нагадвалі часткова тое, што я чуў у іншых кампазітараў. Але паступова майстэрства адточваецца, і ты знаходзіш уласнае гучанне.

***— А калі адчулі, што адбыліся ў прафесіі?***

— У мяне шмат твораў напісана ў розных жанрах. Ёсць сімфанічная, вакальна-інструментальная і камерна-інструментальная музыка. Аперэта, мюзікл, музыка да тэатральных пастановак і іншае. Аднак пра тое, ці склаўся я ў прафесіі, ніколі не думаў. Лічу, што майстэрства заўсёды бачнае і адчуваецца. Ты проста працуеш, ствараеш нешта, а потым гэта ўжо слухаюць і ацэньваюць іншыя людзі. Мне здаецца, што творчы чалавек не можа адбыцца ў прафесіі ў нейкі канкрэтны момант, таму што мастак заўсёды знаходзіцца ў пошуку. Тут добра атрымалася, а там трэба знайсці новае і зрабіць лепш.

Калі працуеш над нейкім творам, то не заўсёды ты ўсім задаволены. І, маючы магчымасць змяняць і паляпшаць напісанае, абавязкова тое робіш. Напрыклад, у мяне ёсць песня «Сена маладое», якая абляцела ўвесь свет. Яна гучала ў Крамлі пры Гарбачове, бо была напісана на злобу дня. І да сёння гэты твор не страціў сваёй актуальнасці, аднак, можа, тое проста ўдача. Увогуле ў творчасці складана сказаць, што добра, а што не, што ўплывае на поспех. Я маю шмат песень, але не ўсе яны аднолькава «раскручаныя» і вядомыя людзям.

***— Як жа сёння кампазітару быць пачутым?***

— Вялікую ролю адыгрывае «раскрутка», але яна патрабуе фінансавых укладанняў. На тыя ж аранжыроўкі патрэбныя грошы. А калі ты сямейны чалавек, то часам даводзіцца выбіраць, куды ўкладвацца. Сёння вельмі шмат кампазітараў-аматараў, але іх музыка аднастайная. Каб песня знаходзіла водгук у сэрцах людзей, трэба яе прапусціць праз сябе. Немалаважна знайсці і свайго выканаўцу. Мне ўвогуле здаецца, што па песні можна вызначыць талент людзей, якія яе стварылі. Напрыклад, я выдзяляю для сябе такіх кампазітараў-песеннікаў, як Васіль Салаўёў-Сядой, Аляксандра Пахмутава, Ігар Лучанок, Юрый Семяняка, Уладзімір Алоўнікаў. Мне падабаецца працаваць з таленавітымі паэтамі.

Алегу Міхайлавічу шчасціць у жыцці на творчае супрацоўніцтва. Кампазітар стварыў шмат песень на вершы такіх паэтаў, як Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, Пятрусь Броўка,

---



## Мікалай Таранда прапануе

# Ухапіць крыху

«І гэта азначала, што быў жнівень і птушкі сталі больш лянотнымі», — словы Уладзіміра Караткевіча размешчаны побач з карцінамі ў адной з залаў Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, якраз той яго часткі, дзе ўладанне беларускіх творцаў. А мастак Мікалай Таранда прыехаў сюды з Оршы, дзе сёння жыве. Дык чаго дзівіцца, што любіць Караткевіча? І не толькі яго, наогул шчыруе на ніве беларускай культуры, стварае дзеля яе адметныя праекты. Мастак-падзвіжнік, кажуць пра такіх. Але тое ведаюць звычайна мясцовыя, хто назірае за творчым жыццём у рэгіёне. А яно ёсць. Напрыклад, у Оршы, акрамя музея Караткевіча, ёсць яшчэ гарадская мастацкая галерэя ў гонар народнага мастака Беларусі Віктара Грамыкі, якая паўстала ў тым ліку дзякуючы энергіі Мікалая Таранды. Аршанцам яго прадстаўляць не трэба. А вось у сталіцы — паказаць на ўсю краіну, — калі ласка. Тым больш творца адзначыў асабісты юбілей. І можна сказаць, экспазіцыя стала вынікам больш як 50 гадоў яго працы.

У некалькіх зацемненых залах размясціліся творы, на якія скіраваныя промні святла. Эфект працуе асабліва з гэтымі творамі: нібыта фрагменты жыцця запаліліся і іграюць самымі рознымі адценнямі. Ярка і цёпла — як у жніўні...

Нездарма выстаўка мае назву «Колер жніўня», але тут усё ж не столькі пра прывязку да канкрэтнага часавага прамежку. Хоць некаторыя краявіды або шыкоўныя кветкі той пары года знайшлі сваё адлюстраванне на палотнах. І ўсё ж гэта найперш пра колер, бо Мікалай Таранда не стрымліваў свае эмоцыі, нібыта распляскаў іх па палотнах — вельмі ярка.

Яго выстаўка спадабаецца тым, хто ў мастацтве шукае найперш эмоцыю, імкнецца ўлавіць вобраз. Тут шмат твораў больш абстрактных і тых, што прадстаўляюць фігуратыўны жывапіс. Экспазіцыю ацэняць тыя, каго захапляе каларыстыка. О, даніна імпрэсіянізму, — шмат хто можа падумаць. Але ж насамрэч прыйдзецца згадаць гісторыю мастацтва XX стагоддзя са шмат якімі яго плынямі. І нядзіўна — Мікалай Таранда родам з гэтага стагоддзя і ўвабраў з яго найлепшае. Але кожны творца пры ўліку ведаў пра ўсіх сваіх папярэднікаў знаходзіць уласныя погляд і стыль. Так і Мікалай Таранда выявіўся аўтарам беларускім па светаадчуванні і па любові да колераў, што ўласцівыя нашай зямлі. І да яе кветак, да яе пейзажаў — выяўляе, як адчувае.

Не трэба гадаць, чаму ён робіць так, а не інакш: уплыў Віцебска, які сказаў сваё значнае слова ў развіцці сусветнай мастацкай культуры. Мікалай Таранда — наследнік віцебскай мастацкай школы. Вучыўся на мастацка-графічным факультэце Віцебскага ўніверсітэта, які носіць



Максім Багдановіч, Максім Танк, Янка Купала, Якуб Колас.

***— Пры ўсёй жанравай разнастайнасці, якая ёсць у вашай біяграфіі, у чым хочацца сябе яшчэ апрабаваць?***

— А цяпер працую над балетам. І гэта зусім іншая спецыфіка работы. Там цяжка, але і вельмі цікава. Ідэю пакуль раскрываць не буду, бо ёсць і канкурэнцыя, але, на жаль, не заўсёды сумленная.

***— Для каго больш складана пісаць: для дзяцей ці для дарослых?***

— Для дзетак, таму што ў іх дыяпазон голасу меншы, чым у дарослых. І мелодыю ты пішаш, арыентуючыся на гэта. Яшчэ важна і тое, ці спадабаецца музычны твор у выніку свайму выканаўцу. У мяне напісаны чатыры зборнікі музыкі розных жанраў для дзяцей.

***— Хтосьці з вашых дзяцей выбраў прафесію бацькі?***

— У мяне дзве дачкі і сын, і дзецьмі сваімі я задаволены. Яны ўсе вучыліся ў музычнай школе, але прафесію кожны выбраў сваю. Адна дачка стала піяністкай, другая ў медыцыну пайшла, а сын аддаў перавагу тэхналогіям. Але, на мой погляд, усе дзеці павінны вучыцца музыцы. Па-першае, гэта развівае інтэлект, а, па-другое, не важна, чым яны захочуць займацца па жыцці, але ў іх будзе пачуццё прыгожага і цяга да гармоніі.

***— Улічваючы ваш жыццёвы вопыт, як лічыце, што робіць дзіця шчаслівым?***

— Я пражыў цяжкае жыццё, бо ведаў і голад, і розныя нягоды. Але перакананы, як для дзіцяці, так і для чалавека ўвогуле шчасце ў тым, каб проста жыць. Вось ты маленькі хлопчык, але, нягледзячы на ўсе выпрабаванні, шчаслівы, бо нарадзіўся і жывы. А калі ёсць бацькі, то ты ўдвая шчаслівейшы.

***— А жыць з кампазітарам складана?***

— Спытаць лепш у жонкі, але думаю, ёй няпроста. У творчых людзей думкі заўсёды занятыя работай. Да іх тонкай натуры патрэбен асаблівы падыход, бо ўсё ўплывае на творчасць. Жанчына заўсёды дае натхненне. Жонка для мяне — нязменная муза. Мы з ёй з розных прафесійных сфер і ў нас няма пачуцця рэўнасці да чужога поспеху. Таму я ствараю, а жонка закрывае тыл у сямейным жыцці.

***— Сяброў у вас шмат?***

— З кожным годам, на жаль, іх становіцца менш. Новых знаходзіць ужо няма часу, а былыя сыходзяць у вечнасць. Але ў мяне былі сапраўдныя сябры, з кім мы па жыцці прайшлі разам. Ведаеце, адна справа за сталом сябрамі называцца, а іншая, калі ў розных сітуацыях людзі вас падтрымліваюць, разумеюць і пры неабходнасці падстаўляюць плячо.

***— Добрую музыку вызначае гармонія. Скажыце, а што для вас галоўнае ў жыцці?***

— Мне хочацца, каб людзі жылі ў міры і каб не было вайны. Я помню, якім было жыццё ў акупаваным Мінску, таму галоўнае, няхай у нашай роднай Беларусі будуць мір і дабрабыт. Дзеля гэтага і я працую. Мне важна любіць тых, хто жыве побач, і сваю зямлю. Вышэй носа не пераскочыш, таму сабе і ўсім раю: проста жыві, паспявай рабіць добрыя справы і будзь удзячны за ўсё, што маеш.

**Алена ДРАПКО, фота аўтара.**

# лета

імя П. Машэрава, у такіх вядомых майстроў, як Алег Арлоў, Іван Сталяроў, Альберт Някрасаў — а гэта творцы з яскравай уласнай манерай. І віцебская мастацкая вольнасць уласцівая творам Мікалая Таранды. Віцебскі дух, напэўна, запаліў у ім сэнс чалавека, які неабыякавы да таго, што адбываецца вакол яго, да людзей, што побач, і да мясцін, якім патрабуецца яго ўвага.

Чалавек з энергіяй асветніка. Нарадзіўшыся на Брэстчыне, працаваць і жыць застаўся на Аршаншчыне, дзе шмат якія ініцыятывы здзейсніліся пры яго ўдзеле. Акрамя галерэі, ён яшчэ ажыццявіў знакавы міжнародны праект «Калегіум». Але адначасова з грамадскай дзейнасцю Мікалай Таранда не забываўся на ўласную творчасць. І сёння вельмі актыўна працуе як мастак, услаўляе Беларусь. Кожны дзень ён у майстэрні, кожны дзень працуе, засведчыў сябра і калега Мікалай Ісаёнак. У Мікалая Таранды за 50 гадоў творчага жыцця сотні жывапісных, графічных твораў, выкананых у розных жанрах і тэхніках. За яго плячыма удзел у больш як 40 рэспубліканскіх выставах і 20 персанальных.

— Летась Мікалай Іванавіч адзначаў сваё 75-годдзе. Але гэта такая дата, якую можна адзначаць увесь год, і мы рады вітаць яго выстаўку на пляцоўцы музея, — адзначыла Ганна Конанава, дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. — Атмасфера выстаўкі арганічна адпавядае жнівеньскім настроям дзякуючы яркім, сакавітым, насычаным, недзе нават люмінесцэнтным фарбам у яго палотнах.

Але каго ў жніўні напружвае яркасць? Гэта сапраўды ці не самы смачны месяц года. Пра што сведчаць і цытаты класікаў, якія падмацоўваюць экспрэсію мастацкіх вобразаў. Вось яшчэ адна, ад земляка-віцябляніна Пімена Панчанкі:

*«Жнівеньская ноч*
*як звар'яцела, //*
*Развязала чорныя мяхі.*
*Сотні тысяч зорак*
*пераспелых*
*Сыплюцца на мокрыя імхі».*

**Ларыса ЦІМОШЫК, фота аўтара.**

Кінакрокі

# Адрадзіць традыцыю і напісаць сваю гісторыю

**Здымкі поўнаметражнай кінастужкі «Кіношнікі» ад рэжысёра Кірыла Халецкага летам стартавалі на «Беларусьфільме». У працэсе стварэння новай беларускай камедыі сышліся вопыт і маладосць, і работа над праектам ідзе на студыі маладзёжнага кіно «Смолка». Чым сёння жыве гэтае падраздзяленне і што адбываецца за кулісамі здымачнага працэсу, мы змаглі даведацца, трапіўшы на запуск фільма.**



— У нас галоўны герой — малады спецыяліст, які па размеркаванні прыйшоў на «Беларусьфільм». Таму, хоць у нас і 12 разоў перапісваўся сцэнарый, але тая акалічнасць, што ўся гісторыя адбываецца на кінастудыі, думаю, надасць будучаму фільму асаблівага шарму. Атрымаецца кінастужка пра стваральнікаў кіно непасрэдна на вытворчасці. Шмат у тым будзе праўды жыцця, бо мы паказваем, якія этапы рэжысёр-дэбютант праходзіць у сваёй рабоце. Гэта вельмі цікавы працэс, — распавёў Кірыл Халецкі.

Адпаведна са сцэнарыем, гледачы ўбачаць вынік паглыблення ў прафесію ў канцы аповеду. А сам фільм дасць нам магчымасць зазірнуць, так бы мовіць, у закулісе кінакухні. Паказаць на экране рэальнасць стварэння кіно было для каманды стваральнікаў адным з прынцыповых момантаў. Ім хацелася, каб там было ўсё — і нечаканыя сітуацыі, і праблемы, і гумар, без якога ў рабоце няпроста. Аднак, па словах рэжысёра, не абмінулі яны і актуальную сёння тэму выкарыстання штучнага інтэлекту ў здымачным



працэсе, узнялі пытанне атрымання адукацыі ва ўніверсітэце ў кантэксце папулярных анлайн-курсаў.

— Усё гэта ў нас знойдзе адлюстраванне, прычым у вельмі цікавай форме. Што да тэмпаў, то мы стартавалі і працуем у зладжаным рытме, — дзяліцца рэжысёр. — У нас сабралася паўнавартасная каманда. Напрыклад, аператар Уладзімір Казятка літаральна нядаўна атрымаў свой чырвоны дыплом УДЗІКа. А гукарэжысёр Анастасія Панасевіч — выпускніца нашай Акадэміі мастацтваў. Акрамя маладых спецыялістаў, працуюць з намі і прафесіяналы з вопытам. Асабліва хацелася б адзначыць нашага мастака-пастаноўшчыка Ігара Хруцкага. Гэта яго далёка не першы фільм, і адчуваецца майстэрства. Мне вельмі падабаецца, што ў нашай камандзе сышліся маладыя і вопытныя людзі і мы разам вучымся працаваць у гармоніі.

Цяпер актыўна ідуць здымкі, а вось падрыхтоўка да старту была працяглай. Так, работа над сцэнарыем ішла месяцамі. У прыватнасці, шмат рэдактуры спатрэбілася для сцэн, дзе прысутнічае гумар. Бо ён — рэч суб'ектыўная, а «кіношнікам» было важна як пасмяяцца, так і нікога не пакрыўдзіць. У ходзе спрэчак і абмеркаванняў усё ж дасягнулі жаданых кампрамісаў.

Невыпадковы і жанр камедыі для будучага фільма. На думку рэжысёра, плакаць чалавека прымусіць проста, а вось рассмяшыць не кожнаму і не заўсёды ўдаецца. Аднак, лічыць Кірыл Халецкі, пачынаць лепш з камедыі, бо гэты жанр прадугледжвае гумар, дынамічнасць, яркасць, што адчуваецца і па разнастайнасці касцюмаў, лакацый, па тэмпе аповеду ў кадры.

Аптымістычна настроены малады творца і адносна таго, што фільм дэбютны. Па-першае, таму што новае выклікае інтарэс, а па-другое, кіно такога кшталту мае сваю нішу на розных кінафестывалях. А значыць, можна будзе заявіць аб сабе не толькі беларускай аўдыторыі.

Здымкі праходзяць на лакацыях кінастудыі «Беларусьфільм», дзе ў распараджэнні здымачнай каманды ўсе магчымасці: напрыклад, цэхі святла, гуку, касцюмаў. Па сакрэце сказалі, што не абыдзецца і без зорных гасцей. А галоўных герояў на экране ўвасобяць Станіслаў Пякарскі, Лаліта Табарко і Аляксандр Асіпец.

— У мяне роля асвятляльніка Жэні, простага 20-гадовага хлопца, які хоць і балбатун, але, як умее, выконвае сваю задачу, — дзеліцца акцёр Уладзіслаў Соладаў. — Гэта не першая мая работа ў кіно, але мяне вельмі падкупіла, што фільм — дэбют Кірыла Халецкага і працуе над ім маладая каманда. А гэта заўсёды новае бачанне, сучасная карцінка. Цікава быць часткай такога працэсу. З людзьмі, занятымі на фільме, мы практычна ўсе равеснікі. Думаем і жартуем на пляцоўцы аднолькава. І ў нас творчая атмасфера, як і павінна быць у такой рабоце, хоць і не заўсёды так складваецца ў вопытных рэжысёраў. Свабода творчасці дазваляе працаваць у задавальненне.

Таксама акцёр адзначае, што рэжысёр кінастужкі, нягледзячы на свой малады ўзрост, паводзіць сябе на пляцоўцы вельмі прафесійна: «Трэба аддаць Кірылу належнае, што прыслухоўваецца да нас, дае прастору для творчасці. На здымачнай пляцоўцы ён тактоўны і заўсёды кажа правільныя рэчы. Мяркую, у гэтага рэжысёра вялікая будучыня, калі ўсё тое ён захавае ў сабе».

А вось акцёр Станіслаў Пякарскі (ураджэнец Магілёва), выканаўца ролі таго самага маладога рэжысёра-дэбютанта, расказаў, што з Кірылам Халецкім яны знаёмыя па супрацоўніцтве ў ранейшых праектах:

— Кастынг-дырэктар даслала мне прапанову запісаць самапробы. І гэта быў першы этап, пасля я прыязджаў у Мінск. Потым доўга чакаў, ці зацвердзяць мяне на ролю. Але вось ужо праект стартаваў і, на шчасце, са мной у галоўнай ролі, — дзеліцца акцёр. — Мой герой Мікалай, мабыць, падобны на мяне толькі вонкава, а ў астатнім, хутчэй, мая супрацьлегласць. Ён таленавіты, сканцэнтраваны і, можна сказаць, такі непрызнаны геній. Аднак гэты хлопец у добрым сэнсе жыве марай зняць сваё кіно. Прычым не проста зрабіць фільм, а добрую, яскравую, нават геніяльную кінастужку, якой яна павінна быць у яго ўяўленні.

На пытанне, як акцёру іграць рэжысёра, артыст спачатку жартуе, што гэта максімальна прыемна, бо ты адчуваеш уладу, а пасля дадае:

— Я маю рэжысёрскі вопыт, няхай гэта былі проста кароткія метры студэнцкай пары. Але арганізоўваць людзей на здымачнай пляцоўцы і ў кадры для мяне не ў навіну. Калі казаць пра Мікалая, то ён вельмі ранімая натура, і такія людзі вельмі баяцца быць не прынятымі. Разам з тым на здымачнай пляцоўцы ён нібыта ператвараецца ў машыну, якая ў сваёй стыхіі і можа ўсё.

Даведаліся мы і пра тое, што, як і любая камедыя, «Кіношнікі» не абыдуцца без прыгожай гісторыі кахання. І назву фільму выбралі невыпадкова. Бо «кіношнікамі» людзі кіно называюць сябе паміж сабой. А гісторыя галоўнага героя пакажа гледачу, што адбываецца ў гэтай суполцы, калі нараджаецца чарговая кінастужка, серыял, дакументальны фільм. Калі ж казаць пра тэрміны і дату прэм'еры «Кіношнікаў», то яны пакуль толькі прыкладныя. Так, здымкі плануюць завяршыць да канца жніўня. А вось прэзентаваць фільм гледачу хацелі б паспець зімой будучага года. Зрабіць тое ў кантэксце 100-годдзя беларускага кіно будзе вельмі сімвалічна.

Увогуле гісторыя галоўнага героя «Кіношнікаў» можа натхніць гледача на пошук паралеляў з асобай самога рэжысёра. Кірыл Халецкі размеркаваўся на «Беларусьфільм» якраз у той час, калі там сфарміравалі студыю маладзёжнага кіно «Смолка». І згадваючы свае ўражанні таго перыяду, малады чалавек кажа, што галоўным было адразу зразумець, што аўтарскае кіно, якое робіш з сябрамі, і кінавытворчасць — гэта дзве розныя рэчы. У першым выпадку вы працуеце сіламі некалькіх чалавек і амаль без бюджэту, «за ідэю». А калі гэта кінавытворчы працэс, то тут адзін рэжысёр нічога не зможа без каманды. Такі пасыл таксама знойдзе сваё месца ў сюжэце.

Калі ж казаць пра студыю маладзёжнага кіно «Смолка», там цяпер з'явілася прастора для творчасці маладых і крэатыўных спецыялістаў самых розных напрамкаў. Для кінастудыі тэндэнцыя на амаладжэнне «Беларусьфільма» сёння ў прыярытэце. Бо толькі такі шлях дазволіць ствараць новае беларускае кіно. І тут адкрытыя для супрацоўніцтва з новымі творцамі: ад сцэнарыстаў да прадзюсараў.

**Алена ДРАПКО, фота аўтара.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Мозырский ДОК» (продавец) извещает о проведении 29 августа 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены лота № 1 на 80 %; лота № 2 на 60 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи для лота № 1:** победитель аукционных торгов дополнительно возмещает расходы по предпродажной подготовке: по определению рыночной стоимости в сумме: **324,00** бел. руб. **Условие продажи для лота № 2:** победитель аукционных торгов дополнительно возмещает расходы по предпродажной подготовке: по определению рыночной стоимости в сумме: **14 867,29** бел. руб. | | | |
